Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАЧЫ—XV
№ 16 (3920)
СУБОТА, 17 СТУДЗЕНЯ
1931 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫНКА

Пад знакам барацьбы за генэральную лінію партыі

Праз тры дні пачынаюцца перавыбары Менскага гарадзкога савету. У прамысловых цэнтрах БССР ужо зараз разгарнуліся перавыбары гарадзкіх саветаў.

Перавыбары ў гэтым годзе супадаюць з пачаткам трэцяга году пяцігодкі—рашаючага году сацыялістычнага наступлення. Пасляховае выкананьне заданьняў трэцяга году пяцігодкі—цьвёрдая гарантыя выкананьня ўсяго пяцігадовага пляну за чатыры гады—перамогі сацыялізму ў нашай краіне. У гэтым—вялізарнае значэньне трэцяга году пяцігодкі. У гэтым—вялікае адрозьненьне перавыбарчай кампаніі г. г. ад усіх мінулых кампаній.

Перавыбары падводзяць выніні буйнейшым посьпехам у індустрыялізацыі краіны і канцентрацыі сельскае гаспадаркі, дасягнутым на падставе кіраўнічага ажыцьцяўленьня гэнэральнай лініі партыі ў жорсткай барацьбе на два фронты супроць правых і «левых» апартуністаў.

Наперакор працоцтвам правых і «левых» апартуністаў, перамагаючы ўсе труднасьці, пралетарыят БССР, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, з посьпехам выканаў прамфінплян 1930 г. і ўдарнага кварталу.

Мы дабіліся выключных посьпехаў і ў тых адносінах, што канчаткова ліквідавалі беспрацоўе, вырашылі праблему, на якую ў мінулых перавыбарчых кампаніях была зьвернута асаблівая ўвага працоўных.

Калі ў 1926 годзе на будаўнічых работах у г. Менску было занята 5.500 рабочых, дык у 1929 г.—7.500, а ў 1930 г.—звыш 10.000 рабочых.

Выдаткі на будаўніцтва ў 1929 г. складалі 7.757.000 р., у 1930 г.—14.000.000 р. Шырока разгорнутае капітальнае будаўніцтва дало магчымасьць уцягнуць у прадпрыемствы новыя кадры рабочых і давесьці валавую прадукцыю прамысловасьці Менску да 82 [illegible] руб.

За апошнія два гады ў строй уступілі 10 новых прадпрыемстваў, колькасьць рабочых у прамысловасьці гораду павялічылася з 5.700 да 13.000 чал.

Гэтыя два гады далі нячуваны гістарычны зрух на вёсцы. Асноўныя масы сялянства павярнулі на шлях сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Вялізарныя посьпехі дасягнуты намі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ленінскай партыі, гарачынаму энтузіязму і растучай актыўнасьці рабочай класы, якія выліліся ў хвалю сацспаборніцтва, ударніцтва і сустрэчных прамфінпляну.

Нашы посьпехі асабліва рэльефна вызначаюцца на фоне нячуванага эканамічнага крызісу, які перажывае капіталістычны сьвет, крызісу, які падрывае асновы капіталістычнага ладу.

Эканамічны крызіс перарастае ў палітычны—магутная хваля стачак патрасае буржуазныя краіны. Буржуазія шукае выхаду з тупіку, шукае ратунку, падрыхтоўваючы новыя войны, новы напад на краіну Саветаў.

Дзьве сыстэмы стаяць адна супроць другой — капіталістычнай дыктатуры, якая пад сьцягам фашысцкага тэрору ідзе да пагібелі, і сыстэма пралетарскай дыктатуры, якая, разгортваючы савецкую дэмакратыю, ліквідзе класы, будуе сацыялізм і мацнее і разьвіваецца з кожным годам.

У сьвятле гэтага асабліва ярка вызначаюцца надзвычай адказныя задачы, якія стаяць перад намі ў трэцім годзе пяцігодкі, годзе, рашаючым завяршэньне будаўніцтва фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Гэтыя гіганцкія задачы патрабуюць РАШУЧАЙ ПЕРАБУДОВЫ ЎСЁЙ РАБОТЫ ГАРАДЗКІХ САВЕТАЎ—органаў дыктатуры пралетарыяту, узьняцця іх ролі, як праваднікоў гэнэральнай лініі партыі.

Работу саветаў трэба перабудаваць у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага перыяду. Трэба, каб саветы на справе павярнуліся тварам да сацспаборніцтва, да ўдарніцтва, да калгаснага будаўніцтва.

Справаздачная кампанія гарсаветаў паказала, што яны яшчэ ня ўсюды здолелі перабудаваць сваю работу, што яны ў радзе месц адстаюць ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, ня сталі яшчэ на чале актыўнасьці мас, не пераключыліся на ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнай рэканструкцыі, слаба кіравалі сацспаборніцтвам, работай каапэрацыі ў галіне рабочага забесьпячэньня, былі вельмі слаба зьвязаны з масамі, не мабілізавалі мас на барацьбу з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі, з бюракратызмам і недахопамі ў рабоце савецкага апарату.

«Партыя, якая кіруе ўсёй справай сацыялістычнага будаўніцтва, зрабіла больш за ўсе іншыя арганізацыі ў адносінах перабудовы сваёй работы, у адпаведнасьці з задачамі пэрыяду сацыялістычнай рэканструкцыі. Ёсьць пэўны зрух у прафсаюзах. АДСТАЛІ САВЕТЫ і каапэрацыйныя органы. Між тым, выкананьне гіганцкіх задач 1931 г. патрабуе рашучага паляпшэньня работы ўсіх масавых арганізацый, усяго дзяржаўнага апарату»,—сказаў у заключным слове на сесіі ЦВК старшыня СНК Саюзу т. В. М. МОЛАТАЎ.

Мы ідзём на падставе матар'ялаў абсьледаваньня «Правды» і «Зьвязды» сыгналізавалі аб прарывах у рабоце МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ, аб выпушчанай ім дэяляцкай справаздачы, якая адлюстроўвае папітычную бездапамочнасьць і апартуністычную недаацэнку перавыбараў з боку кіраўнікоў гарсавету.

На працягу сямі дзён студзеня ў Менску сарваліся звыш 40 справаздачных сходаў, сарваліся з-за недаацэнкі гарсаветам палітычнага значэньня перавыбараў, з-за няўкі дакладчыкаў.

«Зьвязда» паставіла рубам пытаньне АБ СКАСАВАНЬНІ ТЫХ СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАЎ, ДЗЕ ЗМАЗАНЫ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАМЫЛКІ Ў РАБОЦЕ МЕНГАРСАВЕТУ, ДЗЕ НЕ ЗАВОСТРАНЫ ВУЗЛАВЫЯ ПЫТАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

На старонках «Зьвязды» была адзначана і слабая работа БАРЫСАЎСКАГА гарсавету, апартуністычная недаацэнка перавыбараў з боку Віцебскай гарадзкой выбарчай камісіі і жлобінскіх арганізацый. Сёньня мы друкуем нарэзандзіцыю са Шилова, дзе савецкія арганізацыі ня справіліся з адказнымі задачамі кіраўніцтва перавыбарамі гарсавету, дзе распушчана гарадзкая выбарчая камісія.

Трэба адзначыць, што дагэтуль з боку раду арганізацый НЯ БЫЛО ПАТРЭБНАГА ДЗЕЙСНАГА РЭАГАВАНЬНЯ НА СЫГНАЛЫ ДРУКУ НАОГУЛ, І Ў ПРЫВАТНАСЬЦІ «ЗЬВЯЗДЫ».

Справаздачныя сходы, на якіх зроблены апартуністычныя справаздачы, на якіх змазаны недахопы ў рабоце менгарсавету, яшчэ не скасаваны.

Аўтары палітычна-шкодныя, яўна апартуністычнай справаздачы менгарсавету ня прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Нацыянал-дэмакрат—контр - рэвалюцыянэр Пічэта яшчэ ня выключан з членаў гарадзкога савету.

Жлобінскія партыйныя арганізацыі ня прынялі ніякіх мер, каб ліквідаваць дапушчаныя прарывы, каб актывізаваць ход перавыбараў.

Такія адносіны да голасу рабочых мас, да голасу пралетарскай грамадзкасьці зусім недапушчальны. Мы патрабуем неадкладнага выпраўленьня дапушчаных памылак, ліквідацыі прарываў у ходзе кампаніі, неадкладнага выгнаньня з саветаў усіх апартуністаў і прымірэнцаў.

Рабочыя масы на сваіх справаздачных сходах выкрылі апартуністычныя скажэньні ў рабоце пазасобных гарадзкіх саветаў. Увесь ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі суправаджаецца вялізарным ростам КЛЯСАВАЙ СВЯДОМАСЬЦІ, АКТЫЎНАСЬЦІ ПРАЛЕТАРСКІХ МАС. У выступленьнях на справаздачных сходах ярка выяўлена няўхільнае імкненьне рабочых прыняць непасрэдны ўдзел у перабудове работы гарадзкіх саветаў, непахісная воля выканаць пяцігодку за чатыры гады, яшчэ энэргічней змагацца за генэральную лінію партыі супроць правых і «левых» апартуністаў і прымірэнцаў.

На сходах у Менску, Бабруйску, Віцебску, Гомелі разгарнулася самая бязьлітасная, самая жорсткая крытыка работы гарсавету—рабочыя ўзялі ў штыхі слабую работу ў галіне кіраўніцтва прамысловасьці, рабочага забесьпячэньня, дабрабыту гораду, барацьбы з апартунізмам на практыцы, з вялікадзяржаўным шавінізмам, галоўнай небясьпекай, беларускім нацдэмакратызмам і шавінізмамі розных копераў і г. д. У выступленьнях адчувалася здаровая БАЛЬШАВІЦКАЯ САМАКРЫТЫКА, якая грунтуецца на разуменьні карэньняў часовых труднасьцяй, імкненьні перамагчы іх. Клясава-варожыя выступленьні, імкненьні спэкульнуць на трудносьцях (выступленьні на сходах будаўнікоў г. Менску, рымароў г. Гомелю) сустракалі самы бязьлітасны, самы дружны адпор.

Справаздачная кампанія паказала, што гутаркі апартуністаў аб упадку энэргіі рабочых мас, аб абыякавасьці іх да мерапрыемстваў партыі і ўраду зьяўляюцца ганебнай хлусьнёй.

СПРАВАЗДАЧНАЯ КАМПАНІЯ АМАЛЬВА ЎСІХ ГАРАДОЎ УПРАВАДЖАЕЦЦА РОСТАМ ВЫТВОРЧАГА ЭНТУЗІЯЗМУ, АРГАНІЗАЦЫЯЙ НОВЫХ УДАРНЫХ БРЫГАД, УСТУПЛЕНЬНЕМ У РАДЫ ПАРТЫІ, ЗАКЛЮЧЭНЬНЕМ САЦДАГАВАРОЎ, У ЯКІХ РАБОЧЫЯ АБАВЯЗУЮЦЦА ўзяць штурмам вышыні трэцяга году пяцігодкі.

350 новых ударнікаў імя гарсавету даў бабруйскі дрэвапрацоўчы камбінат. На заводах «Энэргія», «Ударнік» разгарнуўся збор рабочых прапаноў да наказу. Ужо сабрана сотні дадаткаў.

Рабочыя прамысловых цэнтраў БССР пасылаюць у гарсаветы сваіх лепшых прадстаўнікоў - ударнікаў—барацьбітоў за прамфінплян, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады. У СКЛАДЗЕ БАБРУЙСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ ЗВЫШ 50 ПРОЦ. МАНДАТАЎ АТРЫМАЛІ РАБОЧЫЯ-УДАРНІКІ.

20 студзеня пачынаюцца перавыбары Менскага гарадзкога савету.

МАНДАТ ДЭПУТАТА — ЛЕПШЫМ УДАРНІКАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, ЗАГАРТАВАНЫМ У РАШАЮЧЫХ БАЁХ ЗА ПРАМФІНПЛЯН! РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ—У ГАРСАВЕТ НІ АДНАГО АПАРТУНІСТА І ПРЫМІРЭНЦА Ў ГАРСАВЕЦЕ! Пад гэтымі базавымі лёзунгамі павінна праходзіць перавыбарчая кампанія.

Рабочыя-ўдарнікі забясьпечаць каранную перабудову работы гарсавету, дапамогуць яму выканаць вялікія задачы трэцяга году, дапамогуць яму працаваць па-ударнаму—сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі.

Пагалоўны ўдзел рабочых мас у перавыбарах гарсавету, бальшавіцкае правядзеньне кампаніі—зьявяцца лепшым адказам пралетараў г. Менску апартуністам, малаверам, усім ворагам пралетарскай дыктатуры.

Тэмп загатовак тэхкультур ставіць пад пагрозу важнейшы вучастак веснавой сяўбы

Загатоўка тэхнічных культур за другую пяцідзёнку (на лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі) паравальна з першай пяцідзёнкай дала значнае зьніжэньне па ўсіх культурах. Асабліва рэзка панізілася загатоўка ільнянога семя—з 393 тон да 181 тоны; па ільнавалакне—з 252 тон да 153 тон; па канаплях—з 14 тон да 5,2 тоны і пяньцы—з 5 тон да 3,7 тоны. Толькі здача ільняной трэсты ільнапрацоўчым заводам павялічылася з 41 тоны да 72 тон. У рэзультаце на 10-1 1931 г. гадавых пляны па сельска-гаспадарчай каапэрацыі выкананы: па ільнавалакне на 20,3 проц., па ільняным семі—на 44,3 проц., па канаплях—32,4 проц., па пяньцы—усяго на 3,5 проц.

Асноўная прычына такога дрэнага выкананьня пляну зьяўляецца, галоўным чынам, зусім недапушчальная нядбайнасьць саміх загатоўшчыкаў, а ў радзе раёнаў кіруючых і дырэктыўных органаў.

У некаторых мясцох цэлы рад дырэктыў ЦК КП(б)Б аб дачы цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам на выканан. а галоўнае няма ўліку і праверкі выкананьня гэтых заданьняў. Яркім узорам служыць Вушацкі раён, які да 5 студзеня г. г. зусім не займаўся пытаньнем дачы цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам па ільнавалакне. Тэлеграмы і дырэктывы ЦК, СНК і Наркамгандлю ў гэтым раёне да 5 студзеня г. г. ляжалі ў раённых арганізацыях. Толькі 5 студзеня мясцовымі арганізацыямі была накіравана некаторая колькасьць людзей у раёны для ўзмацненьня загатовак і дакладзеньня пляну да кулацка-заможнага двара.

У цэлым радзе выпадкаў адносіны да дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам чыста фармальныя. Характэрны прыклад. У Горацкім раёне—Любанькі сельсавет, вёска Душкі—гр. Хаданькову дана цьвёрдае заданьне здаць 160 кілё ільнянога семя, а ён здаў 174 кілё. Па ільнавалакне дана заданьне здаць 80 кілё, здана ўсяго 32 кілё. Па канаплях і пяньцы заданьня гэтай гаспадарцы не далі, але яна ўсё-ж здала 26 кілё. Гэта гаспадарка бязумоўна не атрымала таго заданьня, якое яна павінна была атрымаць, бо паколькі яна здала 174 кілё ільнянога семя, дык, бязумоўна, можа і павінна здаць ня менш 150-160 кілё ільнавалакна. Калі гэта гаспадарка здала бяз цьвёрдага заданьня 26 кілё канапель, дык яна ня менш павінна была здаць пянькі. Гэта гаспадарка павінна была атрымаць заданьне і па пяньцы і па канаплях. Фактычна-ж адсутнічаў усякі кантроль па выкананьні заданьняў.

Гэта не адзіночны выпадак. Ён ярка сьведчыць аб адсутнасьці ў цэлым радзе месц клясавай пільнасьці, кантролю над выкананьнем кулацка-заможнымі гаспадаркамі цьвёрдых заданьняў, аб фармальным падыходзе, аб правым апартунізьме на практыцы, які зрывае выкананьне пастаноў ЦК КП(б)Б па пытаньні аб загатоўках тэхнічных культур.

«Зьвязда» ня раз сыгналізавала аб далёка ненармальным становішчы ў некаторых калгасах, якія зрываюць загатоўкі ільнавалакна, пянькі і канапель з прычыны дрэннай пастаноўкі арганізацыі працы. У пазасобных калгасах на загатоўках адбіваюцца спажывецкія настроі і адносіны да разьмеркаваньня прадукцыі. Яркім узорам служаць калгасы «Чырвоны шлях» і «1 мая». Першы разьмеркаваў 80 пудоў ільну паміж 28 калгаснымі гаспадаркамі, а другі—50 пудоў. Аб гэтым абураючым выпадку ведалі раённыя арганізацыі і ў першую чаргу райкалгасаюз, але ніхто зусім на іх не рэагаваў. Толькі пасьля, катэгарычнай прапановы Белільнасаюзу і Ільнацэнтру 12 студзеня 1931 г. было пастаноўлена справу перадаць пракурору для прыцягненьня кіраўнікоў гэтых калгасаў да адказнасьці. На такія выпадкі райкалгасаюзы і райкаапэрацыі зусім не рэагуюць або рэагуюць вельмі слаба, і гэта ў той час, калі калгасамі план здачы ільнавалакна на 10-1 1931 г. выкананы ўсяго на 15,4 проц. бяз трэсты, а з трэстаў—на 20 проц.

Збор закантрактаванай працуцы на індывідуальным сэктары адбываецца па-ранейшаму нездавальняюча. Асабліва дрэнна праходзіць здача закантрактаванай пянькі. У радзе раёнаў адсутнічаюць кантроль і ўлік праведзенай ў гэтай галіне работы, а ў некаторых выпадках—гэтай работай амаль не займаюцца (Ворша, Дуброўна, Старобін і інш.). У рэзультаце на 10-1 1931 году закантрактаванага ільнянога семя сабрана ўсяго 68,5 проц., ільнавалакна—41 проц., канапель—32,5 проц. і пянькі—усяго 7 проц. Дырэктыва кіруючых і дырэктыўных органаў аб прыцягненьні да судовай адказнасьці неакуратных здатчыкаў ня выканана. Толькі ў апошнія дні ў гэтых адносінах ёсьць некаторы зрух.

Праўленьне Белкаапсаюзу, разгледзеўшы пытаньне аб ходзе загатовак ільну і канапель, канстатавала, што стварылася катастрафічнае становішча ў галіне загатовак тэхнічных культур, што ставіць пад пагрозу ня толькі выкананьне пляну загатовак, але і забесьпячэньне веснавой пасеўнай кампаніі пасеўнымі матар'ялам.

Справы па некаторых райкаапсаюзах, якія зрываюць загатоўкі, перададзены райпракурорам (Ворша, Дуброўна). У радзе райкаапсаюзаў абноўлен склад (Мсьціслаўль, Гарадок і інш.), а некаторым аробленa апошняе папярэджаньне. Адначасова вылучана кала 20-ці прэмій на суму звыш 6.000 руб. для лепшых раёнаў, лепшых калгасаў і калгаснікаў, а таксама пасобных раённых работнікаў.

Праўленьне Белкаапсаюзу лічыць, што пляны загатовак тэхнічных культур да лютага месяца г. г. у асноўным павінны быць закончаны. Да 1 лютага план загатовак канапель і ільнянога семя павінен быць выкананы на ўсе 100 проц., а ільнавалакна і пянькі ня менш, чым на 65-70 проц. з тым, каб усе сілы кінуць на правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі. Да гэтага-ж тэрміну прыстасоўваецца выдача прэмій тым арганізацыям і работнікам, якія свае плянавыя заданьні выканалі поўнасьцю.

Трэба адзначыць, што па загатоўцы тэхнічных культур, і ў першую чаргу ільнавалакна, раёны садова-гародняй каапэрацыі стаяць на апошнім месцы. Так, заданьне па ільнавалакне садова-гародныя раёны на 10-1 1931 г. выканалі на 10,3 проц.; малочна-жывёлагадоўчыя—на 11,1 проц. і ільнаводчыя—на 26,8 проц. Першае месца па загатоўках ільнавалакна па ільняводчых раёнах займае Лёзьненскі—64,9 проц., Дрысенскі—57 проц., Круглянскі—41,4 проц., Сенненскі—33,6 проц.; з малочна-жывёлагадоўчых раёнаў—Петрыкаўскі 35%, Уваравіцкі—30,7 проц. і Вузьдзенскі—30 проц.

Цягнуцца ў хвосьце з ільнаводчых раёнаў: Ветрынскі—3,3 проц., Горацкі—7,6 проц.; з садова-гародных: Гомельскі—3,2 проц. і Віцебскі 7,3 проц.; з малочна-жывёлагадоўчых: зусім не прыступіў да загатовак ільну Самахвалавіцкі раён і цягнуцца ў хвасьце Чырвона-Слабодзкі, які выканаў план на 0,2 проц., Лельчыцкі—0,8 проц. і Койданаўскі—1 проц.

Асноўная зарука посьпеху—рашучы націск на кулацка-заможныя элементы вёскі. Ні ў якім выпадку нецярпіма адсутнасьць праверкі ўліку і выкананьне гэтых заданьняў. Раённыя органы ў бліжэйшыя дні павінны выканаць дырэктыву ЦК КП(б)Б у гэтай галіне. Рашуча павінны быць спынены апартуністычныя гутаркі аб нерэальнасьці плянаў. Неабходна навесьці самую жорсткую барацьбу з правапартуністычнай практыкай. Усе сілы павінны быць кінуты на выкананьне плянавых заданьняў па загатоўках тэхнічных культур.

ЛАЦІС.

Супроць фальсыфікацыі работ канфэрэнцыі па разбраеньні

ДЭКЛЯРАЦЫЯ УРАДУ СССР

З прычыны таго, што цяпер ідзе абкаваньне пытаньня аб старшыні, часе і месцы канфэрэнцыі па разбраеньні, паўнамоцныя прадстаўніцтвы СССР ў Вялікабрытаніі, Нямеччыне, Італіі, Нарвэгіі, Пэрсіі, Польшчы, Францыі і Японіі зрабілі міністрам замежных спраў гэтых краін наступную індэнтычную вусную заяву:

Згодна пастановы большасьці падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні Савет Лігі Нацый на бліжэйшай сесіі возьмецца мусіць, вызначэньня месца і часу скліканьня канфэрэнцыі па разбраеньні і назначэньнем старшыні канфэрэнцыі. Па думцы савецкага ўраду, канфэрэнцыя можа мець міжнароднае значэньне, бо ад вынікаў канфэрэнцыі можа ў значнай ступені залежаць пытаньне аб працягненьні і замацаваньні міру і аб новай зьнішчальнай вайне. Савецкі ўрад ня раз выказаўся ў тым сэнсе, што пры існуючых умовах адзінай гарантыяй захаваньня міру было-б разбраеньне, або, прынамсі, максымальнае скарачэньне ўзбраеньняў. Ён уносіў адпаведныя праекты канвэнцыі ў падрыхтоўчую камісію на разбраеньні і зноў прадставіць іх на разгляд самой канфэрэнцыі. Гэта паказвае асаблівую зацікаўленасьць Савецкага Саюзу ў посьпеху канфэрэнцыі і яго гатоўнасьць прыняць у работах канфэрэнцыі самы актыўны ўдзел. Па думцы савецкага ўраду, пасьпяховасьць работ канфэрэнцыі патрабуе забесьпячэньня поўнае роўнасьці ўсіх удзельнікаў канфэрэнцыі, як вялікім, так і малым дзяржавам.

Ён, аднак, вымушан канстатаваць, што гэта роўнасьць парушылася ў падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні ў адносінах савецкай дэлегацыі ня толькі пастановамі самой камісіі, але галоўным чынам яўна адпавокімі паводзінамі старшыні камісіі. У пратаколах камісіі можа быць знойдзена нямала доваду гэтага цьверджаньня. Патрабаваліся асабліва вытрыманасьць і цярплівасьць савецкай дэлегацыі, а таксама ўсьведамленьне ёю вялізарнага значэньня, якое надаецца яе ўрадам справе разбраеньня, каб яна ня спыняла свайго ўдзелу ў камісіі пад уплывам бястактнасьцяй і грубасьцяй старшыні. Паводзіны старшыні бяспрэчна, выклікаліся, між іншым, і яго прыналежнасьцю да такой дзяржавы, якая на працягу 14 год ухіляецца ад нармальных зносін з Савецкім Саюзам, пазбаўлена сапраўдных крыніц інфармацыі аб Саюзе і таму больш іншых капіталістычных краін падпадае забабонам ў адносінах СССР.

Выходзячы з гэтага, савецкі ўрад мяркуе, што ўдзел у выбарах старшыні канфэрэнцыі павінен быць прадастаўлен ўсім членам канфэрэнцыі бяз выключэньня, і што таму старшыня павінен быць назначаны ня групай дзяржаў, а таксама не арганізацыяй, да якой належаць ня ўсе ўдзельнікі канфэрэнцыі, а пленумам самой канфэрэнцыі. Савецкі ўрад далей мяркуе, што старшынёй, а значыцца кіраўніком такой важнай сусьветнай канфэрэнцыі, ня можа быць выбраны прадстаўнік такой дзяржавы, якая заняла ўжо ў падрыхтоўчай камісіі па разбраеньні пэўную адмоўную пазыцыю ў адносінах разбраеньня, або дзяржавы, якая мае разьвітую ваенную прамысловасьць міжнароднага значэньня, а значыцца эканамічна зацікаўленай у захаваньні і павялічэньні ўзбраеньняў і, нарэшце, дзяржавы, якая не падтрымлівае нармальных адносін з усімі дзяржавамі — удзельнікамі канфэрэнцыі. Само сабой зразумела, што старшынёй канфэрэнцыі таксама ня можа быць абрана асоба, якая вядома сваімі публічнымі выступленьнямі, або сваімі забабонамі супроць тэй ці іншай дзяржавы.

Далей, для пасьпяховай работы канфэрэнцыі ўсім удзельнікам яе павінен быць забясьпечан патрэбны спакой і магчымасьць сканцентраваць на прадметах работ канфэрэнцыі. Гэтага спакою ў значнай меры была пазбаўлена савецкая дэлегацыя ў падрыхтоўчай камісіі, у выніку варожай атмасферы, створанай вакол яе жэнэўскай прэсай і мясцовымі антысавецкімі арганізацыямі, да ліку якіх трэба аднесьці вядомую міжнародную арганізацыю па падрыхтоўцы інтэрвэнцыі ў СССР, на чале з г. Обарам — апякуном забойцы савецкага паўнамоцнага прадстаўніка т. Вароўскага. Забабоны і прадузятыя думкі супроць СССР, натуральна, мацней у тых краінах, якія ня маюць сваіх прадстаўнікоў у Савецкім Саюзе, пазбаўлены аўтэнтычнай інфармацыі аб ім і жывяцца выключна весткамі безадказных журналістаў.

Таму савецкі ўрад мяркуе, што для месца канфэрэнцыі па разбраеньні павінна быць выбрана краіна, якая падтрымлівае нармальна зносіны з усімі дзяржавамі — удзельнікамі канфэрэнцыі. (ТАСС).

25 ЛЮТАГА— ДЗЕНЬ БАРАЦЬБЫ З БЕСПРАЦОЎ'ЕМ

Адозва рэвалюцыйных рабочых арганізацый

БЭРЛІН, 14. У «Ротэ Фанэ» апублікавана адозва за подпісам цэнтральных камітэтаў камуністычных партый Нямеччыны, Францыі, Англіі, Чэха-Славакіі і Польшчы, а таксама агульна-нямецкага камітэту рэвалюцыйнай прафэсіянальнай Нямеччыны, бюро унітарнай канфэдэрацыі працы ў Францыі, кіраўніцтва руху меншасьці ў Англіі і кіраўніцтва чырвоных прафсаюзаў Чэха-Славакіі. У адозьве гаворыцца:

«З прычыны нячуванага росту беспрацоўя і масавай галечы ў гэту зіму мы зьвяртаемся да кампартый, рэвалюцыйных прафарганізацый і ўсіх рэвалюцыйных арганізацый капіталістычных краін з заклікам арганізаваць 25 лютага міжнародны дзень барацьбы супроць беспрацоўя. Сусьветны імпэрыялізм адказаў на разьвіцьцё гаспадарчага крызісу тым, што бязьлітасна выкінуў на вуліцу больш, чым 25 млн. рабочых з фабрык і заводаў. Адначасова капіталісты імкнуцца з дапамогай працісу масавага беспрацоўя правесьці ўсеагульнае зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню ўсяе рабочае класы.

Супроць гэтага гіганцкага галоднага наступленьня пануючых буйных капіталістаў пралетарыят павінен неадкладна арганізаваць ва ўсіх капіталістычных краінах контрнаступленьне. Адзная вялікая частка арганізаваных рабочых ўсё яшчэ затрымліваецца ад барацьбы сацыял-дэмакратычнымі, рэфармісцкімі і фашысцкімі арганізацыямі, на чале якіх стаяць прысяжныя лёкаі капіталізму. Гэты шкодніцкі ўплыў рэакцыйнай прафсаюзнай бюракратыі павінен быць зломлен шляхам звароту рэвалюцыйных рабочых арганізацый непасрэдна да шырокіх рабочых мас.

Масавая агітацыя, магчыма больш шырокая мабілізацыя беспрацоўных і ў першую чаргу мабілізацыя рабочых на прадпрыемствах за правядзеньне міжнароднага дня барацьбы супроць беспрацоўя 25 лютага—усё гэта павінна быць прароблена зараз-жа.

Пры гэтым уся ўвага павінна быць згуртавана на наступных, самых штодзённых патрабаваньнях, якія пакрываюць патрэбы шырокіх рабочых мас.

Па-першае, неадкладная выдача адначасовай імовай дапамогі кожнаму беспрацоўнаму ў такім разьмеры, які забасьпечыў-бы яму пражытачны мінімум, прынамсі, на працягу двух месяцаў.

Па-другое, страхаваньне ад беспрацоўя ў разьмерах, адпаведных жыцьцёвым патрэбам рабочых, выключна за кошт прадпрыемцаў і дзяржавы.

Па-трэцяе, вызваленьне беспрацоўных ад кватэрнай платы, падаткаў і аплаты камунальных услуг, забарона высяляць беспрацоўных за няўзнос кватэрнай платы.

Па-чацьвертае, сямігадзінны рабочы дзень і шасьцігадзінны рабочы дзень у шкодных для здароўя вытворчасьці і для моладзі, бяз зьніжэньня ўзроўню заработнай платы. Забарона рабіць масавыя звальненьні рабочых.

Да гэтых агульных патрабаваньняў у кожнай пасобнай краіне павінны быць далучаны яшчэ і іншыя канкрэтныя лёзунгі дзеяньня, зьвязаныя з мясцовымі ўмовамі рабочага руху.

Барацьба супроць беспрацоўя павінна быць увязана з барацьбой супроць ваенных падрыхтаваньняў буржуазных дзяржаў. Для працоўных народных мас усё яшчэ няясна, якія жахлівыя злачынствы рыхтуюць патаемна кіраўнікі капіталістычных краін. Англія і ПАВН узбройваюцца для вайны адна супроць адной. Тое-ж самае робяць Францыя і Італія. Увесь імпэрыялістычны сьвет узбройваецца, рыхтуючыся да вайны супроць Савецкага Саюзу. Над ажыцьцяўленьнем гэтага разбойніцкага пляну перш за ўсё працуюць французкі генэральны штаб, вайсковае кіраўніцтва Польшчы, Румыніі, Фінляндыі, Латвіі, Эстоніі, як і ўплывовыя вайсковыя колы Англіі. Міжнародная кампанія буржуазіі, сацыял-дэмакратаў і фашыстаў, накіраваная нібы на змаганьне з «савецкім дэмпінгам», у сапраўднасьці імкнецца адцягнуць увагу працоўных народных мас у краінах капіталу ад сапраўдных вінаватых іх абъяднаньня і шляхам ашуканства ўсыпіць у гэтых масы пераканаьне ў неабходнасьці інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

Якраз 1931 год разглядаецца імпэрыялістычнымі ворагамі Савецкага Саюзу, як рашаючы год для ўсякага роду інтэрвэнцыяністкіх плянаў, бо гэты год будзе рашаючым у справе ажыцьцяўленьня вялікага пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва. Вось таму рабочыя капіталістычных краін з вялізарнай увагай і ахвярай павінны сачыць за ваеннымі падрыхтаваньнямі імпэрыялістаў, вырываць іх і змагацца з імі.

Адзіны выхад, канчатковае вырашэньне пытаньня аб беспрацоўі—рэвалюцыйнае змаганьне за зьвяржэньне капіталістычных урадаў, за заваяваньне ўлады пралетарыятам, за экспрапрыяцыю экспрапрыятараў.

Пад націскам міжнароднага пралетарыяту

ВАРШАВА, 15. Апэляцыйны суд пераглядаеў учора справу Кагана, Сасноўца і Нябескага, прыгавораных акруговым судом да пакараньня сьмерцю за забойства правакатара Седляра.

Каган і Сасновец засуджаны да пажыцьцёвай катаргі, а Нябескі — да аднаго году турмы.

ПОЛЬСКАМУ ФАШЫЗМУ НЯ ЎДАЛОСЯ ЗАМЕСЬЦІ СЬЯДЫ ЎКРАІНСКАГА ПАГРОМУ

ВАРШАВА, 15. Афіцыёзная «Газэта Польска» прысьвячае перадавы артыкул інтэрпэляцыі украінскага клюбу з прычыны «ўціхамірваньня» Заходняй Украіны. Гэты дакумант, як вядома, вельмі пяпрыемны для пілсудчыкаў, бо ён на 72 старонках падрабязна апісвае зусім нячуваны малюнак пагрому, які адбываўся на Зах. Украіне на працягу двух месяцаў. Яшчэ больш пяпрыемна для пілсудчыкаў тое, што вымест інтэрпэляцыі аб пагромах перададзены ў секратарыят Лігі Нацый мэмарандумам украінскага клюбу. «Газэта Польска» лічыць, зразумела, што ўсё гэта робіцца «па рэжэсуры Нямеччыны».

Артыкул афіцыёзу пілсудчыкаў адбівае іх замяшчальнасьць у сувязі з тымі водгукамі, якія атрымаліся во ўсім сьвеце ў выніку «ўціхамірваньня» Заходняй Украіны. Польскія палітычныя дзеячы ўпэўніліся ў тым, што праўды аб «ўціхамірваньні» Заходняй Украіны ня ўдалося захаваць і што ўсюды сталі вядомы падрабязнасьці гэтага нячуванага на разьмерах украінскага пагрому. (ТАСС).

Імпэрыялісты прызнаюць правал кампаніі Чан-Най-Шы па „зьнішчэньні камуністаў"

ШАНХАЙ, 15. Імпэрыялісты прымушаны прызнаць правал кампаніі, якую ўзяў Нанкін супроць Чырвонай арміі ў Кітаі. Амэрыканская газэта «Ленінг Пост», якая выдаецца ў Шанхаі і якая пядаўна патрабавала бязьлітаснага зьнішчэньня чырвоных, піша: «Ёсьць даныя, што чырвоныя атрымліваюць перамогу ў правінцыі Цзянсі. Пасланае для барацьбы з імі войска часткова далучылася да чырвоных, часткова-жа імі акружана. У правінцыі Фуцзян камуністы ня раз атрымлівалі перамогу над ураднымі войскамі і зноў занялі свае старыя пазыцыі. У правінцыі Хубэй, уваходзу гораду Шашы, чырвоныя крыгусілі ўцякаць урадавае войска і ня спынялі праследаваньне іх. Адносна правінцыі Хунань лепш зусім ня ўспамінаць.

Чан Кай-шы, які пядаўна заяўляў краіну, што ён неадкладна і поўнасьцю зьнішчыць чырвоных, бяспрэчна перадаціў здольнасьці сваіх генэралаў і недаацэніў сілы чырвоных, якія ня толькі не ўцякаюць пры набліжэньні ўрадавага войска, але самі пераходзяць у наступленьне, наносячы паражэньне ўрадавому войску».

Як паведамляе японскае тэлеграфнае агенцтва Сімбун Рэнга, гандлёвыя колы гораду Чанша прыходзяць да вываду, што «кампанія зьнішчэньня камуністаў» і пагранічных раёнаў правінцый Хунань і Цзянсі ня прынесла колькі-небудзь карысных рэзультатаў. (ТАСС).

Баярскія мэтады „ліквідацыі" беспрацоўя

ВІЕНА. В Бухарэсту паведамляюць, што румынская рада міністраў прыняла пастанову «ліквідаваць у сваёй сферы беспрацоўе». Для гэтай мэты міністэрства ўнутраных спраў прапанавала дырэкцыі чыгунак прадставіць пэўную колькасьць таварных вагонаў для высыпкі беспрацоўных з Бухарэсту ў месцы іх нараджэньня. Беспрацоўныя, што нарадзіліся ў Бухарэсце, будуць адпра

КРОУ ЛЕДЗЯНЕЕ У ЖЫЛАХ

Крывавая оргія польскага фашызму ў Зах. Украіне

АРЫШТАВАНЫМ ЗАБІВАЮЦЬ ПАД ПАЗНОГЦІ ШПІЛЬКІ, ЦКУЮЦЬ САБАКАМІ-ВАУКАМІ, УЛІВАЮЦЬ ПРАЗ НОС ПА НЕКАЛЬКІ БУТЭЛЕК МАЧЫ, ЖАНЧЫН — ГВАЛЦЯЦЬ, ВЕШАЮЦЬ ЗА ВАЛАСЫ

ВОСЬ ЯКІМІ МЭТАДАМІ ПІЛСУДЧЫНА РЫХТУЕ ТЫЛЫ НА ВЫПАДАК ВАЙНЫ З СССР

Крывары тэрор на Зах. Украіне

Крывавы тэрор фашысцкага ўраду Польшчы на Зах. Украіне, тэрор, ад якога стынне ў жылах кроў, ня спыняецца. Ня ўтойваюць, а, наадварот, з надавычайным цынізмам пацьвярджаюць гэта афіцыяльны польскі друк і сам фашысцкі ўрад Польшчы. Азьвярэлы пыхар Пілсудзкага - палкіна міністар унутраных спраў Складкоўскі з трыбуны сойму ясна і «без обиняков» заявіў, што мэтады, якімі карыстаюцца паліцэйскія і вайсковыя карныя атрады, былі неабходны і нямінучы з прычыны вялізарных равьмераў рэвалюцыйнага руху, які выбухнуў на Украіне. «Паліцэйскія, — гаварыў арганізатар новай Варфаламееўскай ночы, — не наступнікі танцаў і салённым спосабам паступаць ня могуць». Гэта правільна — паліцэйскія не наступнікі танцаў. Але востры характар рэвалюцыйнага руху украінскіх працоўных мас паказвае з усёй відавочнасьцю, што ўся гэта фашысцкая банда катаў імкнецца танцаваць на выбухаючым вулкане.

Немагчымыя сацыяльна-эканамічныя і нацыянальныя ўмовы фашысцкага рэжыму, у якіх зітаральна задыхаюцца працоўныя масы Украіны, — вось крыніца той гераічнай барацьбы, якую вядуць (працоўныя масы) узьнялі супроць фашысцкага ярма.

Фашысцкі ўрад Пілсудзкага, рыхтуючыся шаленымі тэмпамі да інтэрвэнцыі супроць СССР, пачаў праводзіць на Зах. Украіне і Зах. Беларусі такую палітыку, якая-б накрытавала тут вялізнай плацдарм для ваенных дзеяньняў і спакойны тыл. У аграрнай галіне гэта выявілася ва ўмацаваньні украінскага кулака і паменчыкаў, у насаджэньні польскіх асадніцкіх шляхам камасацыі, нарэшце і ліквідацыі сэрвітутаў. Дапамагаючы капіталістам праводзіць наступленьне на рабочую клясу (зьніжэньне заработнага шляхам арбітражу, закрыцьцё ўсіх рэвалюцыйных рабочых арганізацый, фашысцкі ўрад знайшоў сабе вернага саюзьніка ў асобе украінскай буржуазіі, якая дрыжыць перад перспэктывай рэвалюцыі, што ўсё больш і больш набліжаецца. З другога боку, нанучаньні на Зах. Украіне моцнага рэвалюцыйнага руху сярод пралетарыяту і селянскіх мас рабіла гэты будучы плацдарм інтэрвэнцыі вельмі і вельмі непадзейным, а таму польскі фашызм паранаў з гэтым рукам пакончыць.

Бязлітасна задушэньне нацыянальна-вызваленчага руху на акупаванай Зах. Украіне і Зах. Беларусі, крывавыя расправы з беспрацоўнымі і бастуючымі рабочымі, забарона рэвалюцыйных арганізацый рабочае клясы і прадоўных мас арышты тысяч рабочых і селян — усё гэта робіцца ў імя тых падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР, бо толькі ў інтэрвэнцыі польскі імпэрыялізм бачыць выратаваньне з ціскоў вострага эканамічнага і палітычнага крызісу і пагрозы пралетарскай рэвалюцыі, якая шпарка набліжаецца.

Такім чынам, «пацыфікацыя» Зах. Украіны зьяўляецца адным з этапаў падрыхтоўкі польскім фашызмам узброенага нападу на Савецкі Саюз.

Масавая забастовачная хваля сельскагаспадарчых рабочых, якая пракацілася ў 1928-29 годзе, ні ў чым не палепшыла іх эканамічнага становішча. Вялізарныя падаткі, што выціскаюцца ўрадам Пілсудзкага на пакрыцьцё вялізарнага ваеннага бюджэту, кідаюць працоўнае сялянства на дно надавычайнай галечы, а таму вострыя формы барацьбы супроць усёй фашысцкай сыстэмы былі нямінучы.

На ўсёй Зах. Украіне запалалі маёнткі памешчыкаў і кулакоў украінскіх і польскіх. Гэта даводзіла, што пачаты рух носіць клясавы характар. Рух накіроўваўся таксама непасрэдна супроць фашысцкай дзяржавы (забойствы войтаў, абстрэлы карных атрадаў, зьнішчэньне тэлеграфных і тэлефонных зносін). Такіх фактаў мноства. Фашысцкая акупанцкая ўлада захіталася.

Фашысцкі ўрад для задушэньня рэвалюцыйнага руху паслаў на украінскія вёскі карныя экспэдыцыі. Разьвішаная салдатня і паліцэйшчына сваю задачу выканалі з перавышэньнем. У кароценькім газэтным артыкуле няма ніякай магчымасьці пералічыць нават і тысячную частку тых зьверстваў і здзекаў, якія ўжываліся польскай паліцэйшчынай супроць украінскіх працоўных мас. Пабоі і забойствы сялян прымялі масавы страшэнны характар. Насельніцтва цэлымі паветамі хавалася ў лясох. Зґвалтаваньне жанчын, і нават малалетніх, увайшло ў звычай пры наведваньні вёсак азьвярэлай паліцэйшчынай.

У вёску Гарадзенавіч, Бібрскага павету, прабіў палёт карны аддзел 14 пал ка ўланаў. Зараз-жа правялі рэквізыцыю фуражу і харчовых запасаў, забіраючы ў сялян апошнае. Да поўсьмерці зьбілі 70-гадовага старога і пекальких жанчын. Салдаты зґвалцілі малалетнюю дзяўчынку, якую прынялося адпраўіць потым у шпіталь. А такіх прыкладаў можна падаць сотні і тысячы.

Актыўны ўдзел у гэтай «пацыфікацыі» прымала украінская буржуазія і сацыял-фашысты, ня раз у прэсе хвалячы ўсе мерапрымствы фашысцкага ўраду ў гэтай галіне.

Украінскія працоўныя масы канчаткова пераканаліся, што сацыял-фашызм і «свая» нацыянальная буржуазія, якая многа разы ашуквала іх нацыянальнымі лозунгамі «свабодай Украіны» — такія-ж бязьлітасныя клясавыя ворагі, як і польская буржуазія і сацыял-фашызм.

Новае шаленства польскага фашызму

Пілсудзкі ўсё «пацыфікуе». Яшчэ не ачуналі ахвяры паліцэйскіх катаваньняў ва Львове, арыштаваныя ўвосень рабочыя, асуджаныя за прыналежнасьць да КПЗУ, якіх цэлымі тыднямі трымалі ў паліцыі, білі да страты прытомнасьці, наполі іголкамі пад пазногці, улівалі ваду ў нос, у вушы і г. д.

Яшчэ ляжаць у турэмнай больніцы і дагараюць ахвяры гэтых катаваньняў, РАБОЧЫ ЛЕВІН І РАБОТНІЦА ШТЫФТЭР, ЯКАЯ БЫЛА СТРАШЭННА ЗБІТА І ПАСЬЛЯ ГЭТАГА ЗҐВАЛТАВАНА і зноў ужо тры тыдні дэфэнзыва выпоўлівае па вуліцах гарадоў і вёсак Заходняй Украіны рабочых дзеячоў, каля 100 чалавек вывозіць у Луцк на Валыні, каб там аддаць іх у рукі вядомых ПАЛІЦЭЙСКІХ САДЫСТАЎ ЗАРЭМБЫ. Кавальчука і іншых для катаваньняў. Арыштаваных у пачатку гэтага месяца каля 20 рабочых і работніц — МІКОЛУ ПАЎЛІКА, ФЭРДЫНАНДА СТАЛЯРЧУКА, РУСЬКУ ВАЙСБЭРГ, ШЭХЦЕРА, МАТУЛЕЎНЯ І ІНШ. — 5 ДЗЁН БАЗІЛІ З ЛЬВОВУ Ў ЛУЦК У ТАВАРНЫХ ЦЯГНІКОХ БЯЗ ЕЖЫ. У дарозе ўсіх катавалі і білі нячуваным спосабам. Даходзяць лісты, у якіх яны просяць, каб дапамагчы ім вырвацца з рук бандытаў, бо ў адваротным выпадку ні адзін з іх ня выйдзе жывым на свабоду. НІКОГА З ЧЛЕНАЎ СЯМ'І, НІ АБАРОНЦОЎ ДА АРЫШТАВАНЫХ НЕ ДАПУСКАЮЦЬ. Так што зараз няма больш вестак аб іх пёсе. Усіх арыштаваных перавезьлі ціпер з Луцку ў іншую турму. З-за турэмных сьцен прарвалася адна вестка, што ў турме пк быццам забіті дэфэмега на тэрыторыі Зах. Украіны рабочага дзеяча, шматгадовага рэдактара рабочых газэт, кіраўніка прафсаюзнага руху, КАНДЫДАТА Ў СОЙМ СА СЬПІСУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА БЛЕКУ ТАВ. МІКОЛУ ПАЎЛІКА. Сьпісаны з Перамышлю.

Там-жа як ужо ўстаноўлена, забіті рэвалюцыйнага сялянскага дзеяча з Холмшчыны тав. СЦЦЯПАНА БОЙКА. У Холмскай турме памерла ад пабоя работніца АРЭНШТЭЙН.

Лібэральныя сацыял-фашысцкія палітыкі Польшчы, прафэсары унівэрсытэтаў, літаратары і інш. «гуманісты» ўзьнімаюць зараз вялікі крык вакол Берасьця, які, аднак, бляднее перад гэтымі жудаснымі фактамі, што разыгрываюцца за турэмнымі сьценамі паліцэйскіх арыштаў У ЛУЦКУ і ІНШ. ГАРАДОХ. Усе гэтыя «пацыфісты» крычаць, што Берасьце «гэта ганьба для Польшчы, культуры і цывілізацыі». Буржуазны друк расьпісваецца аб выяўленых фактах у працэсе збойства, дзе катаваньнямі прымусілі нявінна арыштаваных прызнаць сваю віну, — але НІХТО НЯ ЎЗЬНІМАЕ НІ СЛОВА ПРА ЗАХ. УКРАІНСКУЮ БАСТЫЛІЮ — ЛУЦК. ПРА БАНДЫТАЎ ЗАРЭМБУ, КАВАЛЬЧУКА І інш., хаця паліцэйскія інквізытары катуюць свае ахвяры да сьмерці.

Таварышы ЛЕВІН, ЦЭБРУН, УНШВАЙФ, ШАЯН, ШУР, МАНДЭЛЬ І ТЫСЯЧЫ ІНШЫХ пераносяць нечалавечыя пакуты ў турмах «культурнай Польшчы». Каб вымусіць паказаньні, АРЫШТАВАНЫМ ПРЫПЯКАЮЦЬ ЖАЛЕЗНЫМІ ГАРАЧЫМІ ПРУТАМІ ПЯТЫ. ЗАБІВАЮЦЬ ПАД ПАЗНОГЦІ ІГОЛКІ, НАЛІВАЮЦЬ У НОС І ВУШЫ ВАДУ І МАЧУ, ЖАНЧЫН ВЕШАЮЦЬ ЗА ВАЛАСЫ і г. д. 17-ГАДОВУЮ РАБОТНІЦУ ШТЫФТЭР ЗҐВАЛЦІЛІ. ПАСЬЛЯ ЎЛАЖЫЛІ ЁЙ У ПАЛАВЫ ОРГАН РАСПАЛЕНЫ ДРОТ, а калі яна ў выніку гэтага атрымала крывацячэньне, перакесьлі яе ў турэмную больніцу і ЗЬМЯСЬЦІЛІ ПАМІЖ СЫФІЛІТЫКАМІ. ЛУПЦАВАНЬНЕ ГУМОВЫМІ ПАЛКАМІ — ГЭТА ШТОДЗЕННАЕ ЗЬВІВШЧА Ў ПОЛЬСКІХ ТУРМАХ І ЎЖО НЕ ЗВАРАЧАЕ НА СЯБЕ ЎВАГІ ПАЛІТЫКАЎ ЗЬНЯВОЛЕНЫХ. У пуцкай турме трымаюцца СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ САБАКІ-ВАЎКІ, ЯКІХ НАЦКОЎВАЮЦЬ НА АРЫШТАВАНЫХ. Такі сабака кідаецца на стомленага, слабага чалавека, кусае яго дзяры цела, твар, адзеньне. Гэтыя сабакі наводзяць на арыштаваных нячуваны жах. ЛЮДЗІ ВАР'ЯЦЕЮЦЬ. Гэта спэцыяльнае вынаходзтва належыць заспуканаму обэр-шпіцу «свабоднай», «культурнай» польскай рэспублікі — ПАНУ ЗАРЭМБЕ.

Бар'яцтва, самагубства ў польскіх турмах — гэта штодзеннае зьявішча. За апошні час арыштавалі НІНУ МАТЫЛЕЎНУ з Львова, КАНДЫДАТКУ НА ПАСЛА Ў СОЙМ СА СЬПІСУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА БЛЕКУ. Яна не магла перанесьці катаваньняў паліцэйскіх шпікаў і зрабіла спробу на самагубства, перарэзаўшы сабе горла. Зараз яна змагаецца са сьмерцю ў паліцэйскай больніцы ў Луцку. Пра ўсё гэта маўчаць цэнтралевыя сацыялісты, усякія Недзялюўскія, а за іхі ўся фашысцкая банда. Бо рабочых і сялян у Польшчы, у асаблівасьці заходня-украінскіх рабочых і сялян, якія змагаюцца за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне, можна зьбіваць, бо яны ПА-ЗА ЗАКОНАМ, бо рабочых і сялян катуюць у Польшчы ўжо 12 год.

Маўчаць, бо самі Вітасы, Кернікі, Тугуты, Карфанты хваляць і прыкрываюць усе злачынствы і забойствы гэтага самага Зарэмбы, які да сёньняшняга дня забівае заходня-украінскіх рабочых. Кожны год СОТНЯМІ І ТЫСЯЧАМІ ПРАПУСКАЛА ПРАЗ СВАЕ РУКІ ДЭФЭНЗЫВА НА ВАЛЫНІ УКРАІНСКІХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН, ЗЬНІШЧАЛА ФІЗЫЧНА, ФАБРЫКАВАЛА ПРАЦЭСЫ, ПРЫГАВОРВАЛА ДА 1.000 ГАДОЎ ТУРМЫ. Яны хвалілі і зараз няма ад іх ні слова пратэсту супроць катаваньняў і забойстваў у турмах і дэфэнзывах рабочых і сялян, і гэта не зьяўляецца «ганьбай» для Польшчы, «культуры» і «цывілізацыі».

З часу акупацыі Польшчай украінскіх зямель крывёю украінскага пралетарыяту і сялянства афарбоўваюцца кожны год турмы на Зах. Украіне. КОЖНЫ ПАЛІТЫЧНЫ ПРАЦЭС — ГЭТА МАЛЮНАК З ЧАСОЎ ІНКВІЗЫЦЫІ, а Тугуты, якія чупі не адзін расказ пра катаваньні ад ахвяр Зарэмбы, ДАВАЛІ ЗАРЭМБЕ ОРДЭНЫ І ВЫШЭЙШЫЯ ЧЫНЫ.

Працоўным Зах. Украіны, усёй Польшчы, іх сыном у турмах і дэфэнзывах польскай буржуазіі няма чаго чакаць ад цэнтралевых сацыялістаў і прафэсараў «гуманістаў». Толькі гучны голас рабочае клясы Польшчы і ўсяго сьвету прымусіць крывава ката Пілсудзкага і яго генэралаў спыніць забойствы рабочых і «пацыфікацыю» вёсак.

У імя клясавай салідарнасьці рабочыя СССР і ўсяго сьвету стануць на абарону сваіх братоў, якія катуюцца ў турмах польскага фашызму.

Супольны іх вораг, які падрыхтоўвае вайну супроць бацькаўшчыны пралетарыяту ўсяго сьвету, хоча фізычна зьнішчыць рэвалюцыйны актыў, каб такім спосабам забясьпечыць выкананьне сваіх ваенных плянаў.

ПРАЛЕТАРЫЯТ УСЯГО СЬВЕТУ ПАВІНЕН УЗЬНЯЦЬ МАГУТНЫ ГОЛАС ПРАТЭСТУ І НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ ДА ЗАБОЙСТВАЎ ЗАХОДНЯ-УКРАІНСКІХ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ У ФАШЫСЦКІХ ДЭФЭНЗЫВА І ТУРМАХ ПОЛЬШЧЫ.

АХВЯРЫ
фашысцкага тэрору

Уверсе на здымках:—целы заходня-украінскіх сялян, скатаваных паліцэйскімі і жандарамі Пілсудзкага.

Агляд друку

Ворах памылак

Ёсьць пагаворка, народжаная на старонках нашых гумарыстычных часопісяў. Яе едкае джала накіравана супроць апартуністаў і наогул супроць людзей, якім улясьцівы апартуністычныя хістаньні. Яна кажа:

«Выпраўляючы свае памылкі, не нарабі другіх».

* * *

У № 5 «Беларускай вёскі» зьмешчана рэдакцыйная перадавая «Да ленінскіх дзён». Тэма перадавой цалкам вызначае ўе палітычныя мэты і адказнасьць. Але павяу папярхоўны прагляд гэтага артыкулу паражае багацьцем недарэчных, палітычна няпісьменных фраз і проста апартуністычных памылак. Некалькі яркіх прыкладаў.

Аўтар перадавой, напрыклад, наведамляе чытачом «Беларускай вёскі», што мінула ўжо «сем год, як партыя дала лёзунг суцэльнай калектывізацыі...», што мы ўжо «ўзьнялі на аграрную вышыню сацыялістычную прамысловасьць» і г. д.

Аднак, гэта толькі надавычайная палітычная няпісьменнасьць, бязглузьдзіца, якая, магчыма, зьяўляецца рэзультатам недапушчальнай нядбайнасьці. Галоўнае ня ў тым...

Галоўнае ў тым, што ў артыкуле нічога не гаворыцца аб барацьбе на два фронты, аб ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, аб задачах далейшага разгортаньня бязьлітаснага сацыялістычнага наступленьня.

Аўтар перадавой, падагульваючы хаця-б і некаторыя вынікі сямі год будаўніцтва сацыялізму без Ільліча і вызначаючы нашы чарговыя задачы, прагэтыя пытаньні «забыў» успомніць. На самой справе, у артыкуле, напісаным у сувязі з гадавінай сьмерці Ільліча, няма ні слова аб тым, што вялізарнейшыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ёсьць просты рэзультат непрымірымага змаганьня партыі супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі, супроць «левага» апартунізму і прымірэнцтва, супроць рэштак контр-рэвалюцыйнага трацкізму. Ні намёку на тое, што мы павінны з яшчэ большай непрымірымасьцю змагацца супроць усякага апартунізму, за генэральную лінію партыі. У артыкуле, напісаным да ленінскіх дзён, да якіх КП(б)Б прыходзіць з вялізарнымі перамогамі на фронце ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, аўтар артыкулу ўхітраецца ні аднаго слова не сказаць аб тым, як мы выконваем аспоўны наказ Леніна — вырашаем нацыянальнае пытаньне.

Літаральна ні слова аб нацыянальным пытаньні. Літаральна ні слова аб мабілізацыі калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас адзінаасобнікаў на барацьбу за ленінскі інтэрнацыяналізм супроць шавінізму ўсіх адценьняў, у асаблівасьці супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як найбольш небясьпечнага.

Такім чынам, усё «ня сказана», «прапушчана», «недавыказана». Што-ж сказана, ну, напрыклад, хаця-б на пытаньнях клясавага змаганьня? Паглядзім.

У перадавой гаворыцца:

« ... Сацыялізм будуецца ва ўмовах жорсткага супраціўленьня клясавых ворагаў, кулакоў, шкоднікаў і контр-рэвалюцыянэраў...»

А адсюль аўтар робіць вывад, за які, бясспрэчна, гатовы галасаваць і апартуністы.

«Наша задача — пільна сачыць за кожным крокам нашых ворагаў...»

Такім чынам, «Беларуская вёска» прапануе «сачыць» за тым, як кулак, шкоднік, контр-рэвалюцыянэр прабуюць сарваць сацыялістычнае будаўніцтва. «Сачыць», але не бязьлітасна руйнаваць супраціўленьне ворага, не разгортваць з ленінскай непрымірымасьцю сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце, не змагацца з кулаком і шкоднікам.

Які лібэральны рэцэпт калгасьнікам і адзінаасобнікам, якія пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе авангарду — ленінскай партыі зьнішчаюць супраціўленьне кулацтва, ліквідуемага як кляса на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Фармулюючы задачы перавыбараў саветаў, аўтар перадавой зноў прапануе толькі «сачыць». каб кулакі і іх падпявалы не пралезьлі ў органы пралетарскай дыктатуры — саветы». Зноў толькі «сачыць», але не даваць зьнішчальнага адпору кулацкай агітацыі, не выганяць кулакоў і іх агентуру — апартуністаў з сельсаветаў, не ўмацоўваць органы пралетарскай дыктатуры ленінскімі перадавымі батракамі, беднякамі і калгасьнікамі-ударнікамі. Зноў ні аднаго слова аб змаганьні з апартунізмам, аб згуртаваньні і арганізацыі мас калгасьнікаў і адзінаасобнікаў на барацьбу з кулаком. Такі зьмест усяго артыкулу. Ні слова аб змаганьні з апартунізмам, са скажэньнямі ленінскай нацыянальнай палітыкі, ні намёку на мабілізацыю мас супроць кулака за разгорнутае сацыялістычнае наступленьне. Такавы перадавы артыкул, маючы на мэце падагуліць вынікі сацыялістычнага будаўніцтва (хаця-б і ў максымальна-сьціснутай форме) за мінулыя сем год і мабілізаваць масы калгасьнікаў і адзінаасобнікаў на выкананьне задач трэцяга году пяцігодкі.

. . . . . .

На другі дзень рэдакцыя, напэўна, зразумеўшы, што ў перадавой газэты ёсьць шмат «вузкіх» месц, сьпешацца з паправкай. Паправка зьяўляецца і якая. Апартуністычныя памылкі кампэнсуюцца... тэхнічным недаглядам. Проста характэр не даглядзеў ці наборшчык пераблытаў, памыліўся, паставіў замест слова «адзін» слова «сем» і ўсё... У № 6 «Б. В.» чытаем:

«У перадавым артыкуле «Да ленінскіх дзён» у № 5 ад 10 студзеня ў чацьвертым абзацы дапушчана памылка. Надрукавана: «7 год, як партыя дала лёзунг...». а трэба чытаць «год, як партыя дала лёзунг...»

І ўсё. Як бачыце вінаваты аб'ектыўныя прычыны. Простая прыкрая апячатка. Так «Б. В.» рэагавала на палітычныя зьзягі і апартуністычныя зрывы сваёй перадавой, прысьвечанай ленінскім дням

. . . . . .

Праз два дні ў чарговым нумары «Б. В.» зноў зьявілася ўсё тая-ж «здполучная» перадавая на гэты раз з новымі папраўкамі і заўвагай, у якой гаворыцца:

«Па віне рэдакцыі і карэктуры ў гэтым-жа артыкуле, надрукаваным у № 5 «Б. В.», дапушчан цэлы рад недакладных фармулёвак і памылак, якія выканалі ў палітычныя памылкі. Таму мы яшчэ раз зьмяшчаем гэты артыкул у выпраўленым відзе...»

Згодзімся на хвіліну, што рэдакцыя замест разгорнутай крытыкі адзначаных намі памылак мела права пайсьці на ліпіі найменшага супраціўленьня і перадрукаваць артыкул у «выпраўленым відзе». Што-ж гэта за «выпраўлены від»?

Рэдакцыя выкідае з перадавой цэлы плянісьменныя, недарэчныя фразы (напрыклад, наконт «аграрнай вышыні»), устаўляе пару новых слоў і ... усё. Усе аспоўныя памылкі штампуюцца і застаюцца ўпрытожваць перадавую. Зноў ні адзінага слова аб змаганьні супроць апартуністаў, якія на выгаду шкоднику і кулаку прабавалі рэвізаваць ленінізм і граюць па руку рэстаўрацыі капіталізму ў нашай краіне. Зноў ні слова аб выкананьні наказаў Леніна па нацыянальным пытаньні. І гэта ў артыкуле, прысьвечаным ленінскім дням.

Зноў рэдакцыя штампуе апартуністычныя памылкі перадавой у пытаньнях клясавага змаганьня, хаця яна і падана ў крыху «выпраўленым відзе».

У «выпраўленай» перадавой гаворыцца:

« ... Сацыялізм параджаецца ва ўмовах жорсткага супраціўленьня клясавых ворагаў — кулакоў, шкоднікаў. Наша задача — пільна сачыць, ахоўваць сацыялістычнае будаўніцтва».

І так зноў «сачыць», «ахоўваць», але не наступаць, ня зьнішчаць супраціўленьне клясавага ворага. Хіба-ж ня ясна, што слова «ахоўваць», якое зьявілася ў «выпраўленай» перадавой, толькі апартуністычнае дапаўненьне да лібэральнага рэцэпту аўтара артыкулу аб «слежке» за клясавым ворагам. Бо, лёгічна разьвіваючы гэту мысьль, выходзіць, што мы павінны абараняцца, а не наступаць.

Кулак і шкоднік пры непасрэднай дапамозе дзурушнікаў працуе сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, затармазіць пераможнае наступленьне сацыялізму, а перадавая «Беларускай вёскі» прапануе толькі «сачыць і ахоўваць». Якая мяккацелаесьць, якое прымірэнцтва да клясавага ворага.

Мы абыходзім рад іншых недахопаў гэтай перадавой. Неабходна, аднак, адзначыць, што гэты падвойны прарыў — зьмяшчэньне палітычна няправільнага артыкулу і недапушчальны з пункту гледжаньня бальшавіцкага разуменьня самакрытыкі мэтад выпраўленьня апартуністычных памылак — моў месца пасьля пастановы ЦК КП(б)Б аб «Беларускай вёсцы». Відаць, што тая бязьлітасная крытыка з боку ЦК КП(б)Б апартуністычных памылак «Б. В.» і арганізацыйныя вывады ў рэзультаце крытыкі нічому не навучылі рэдакцыю «Беларускай вёскі».

Н. Красіна

Аб вялікадзяржаўным шавінізьме

Ягта на першым сваім зьезьдзе (1898 г.) партыя фармулявала сваю пазыцыю ў нацыянальным пытаньні наступным чынам: «партыя прызнае за кожнай нацыянальнасьцю права самавызначэньня». Гэта палажэньне ўвайшло потым у першую праграму партыі, прынятую у 1902 г.; гэта-ж палажэньне зьмяшчаецца і ў другой праграме партыі, зацверджанай VIII зьезадам у 1919 г. Права нацый на самавызначэньне, ці за. пряза нацый на самастойнае дзяржаўнае ўстройства, прызнаньне ноўшы роўнапраўя ўсіх нацый, адмаўленьне яміх-бы там ні было форм прымусу ў адносінах нацыянальнасьцей — ня раз пацьвярджалася шматлікімі пастановамі партыі і да, і пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У перыяд да-Кастрычніцкай рэвалюцыі прызнаньне права гоганай нацыі на самавызначэньне зьяўлялася ў руках партыі бальшавікоў моцнай зброяй барацьбы супроць палітыкі царскага ўраду — палітыкі нацыянальнага ўціску і нацыянальнага разгулу, нацыяналізму пануючай рускай нацыянальнасьці.

Іменна на аснове прызнаньня права нацый на самавызначэньне склалася палітыка ленінскай партыі, якая падтрымлівала рэвалюцыйна - вызваленчы рух у Польшчы і на Каўказе, рашуча выступала супроць яўрэйскіх пагромаў, армяна - татарскай разьні і ўсіх іншых спроб нацкоўваньня адной нацыянальнасьці на другую. «Толькі змаганьне ў агульнай згодзе пралетараў усіх нацыянальнасьцей над адзіным сьцягам сацыял - дэмакратыі зможа надаць належны адпор нацыянальнай палітыцы цары-мук, — гаворыць рэзалюцыя канфэрэнцыі сац. - дэмакратычных арганізацый у верасьні 1905 г.

Лёзунг права нацый на самавызначэньне азначаў рашучую і бязьлітасную барацьбу супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, супроць нацыяналізму панаваўшай нацыі. Што справа была іменна так, даводзіць, напрыклад, рашэньне тае самай жнівеньскай нарады ЦК РСДРП з партыйнымі работнікамі ў верасьні 1913 г., што адбывалася пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна. «Што датычыць права прыналежных царскай імпэрыі нацый на самавызначэньне, г. зн. на аддзяленьне і ўтварэньне самастойнай дзяржавы, дык с.-д. партыя бязумоўна шавінна адстойваць гэтае права. Гэтага патрабуе ня толькі ўдзел большасьці насельніцтва Расеі царскай імпэрыі... Гэтага патрабуе пункт зрэнньня свабоды самога вялікарускага насельніцтва, якое нядоўна стварыць дэмакратычную дзяржаву, калі ня будзе вытрэбаны чорнасотенны вялікарускі нацыяналізм, што падтрымліваецца традыцыйнай радзе крывавых расправ з нацыянальнымі рухамі і выкуплена высьмяяньнем ня толькі царскай манархіяй ды ўсімі рэакцыйнымі партыямі, але і галоўнымчынам перад манархіяй вялікарускім буржуазным лібэралізмам, асабліва ў эпоху 1907 - рэакцыі».

З асаблівай вострасьцю наша партыя вяла барацьбу супроць шавіністычнага чаду ў часе імпэрыялістычнай бойні. Гэта бойня была вайной за новы перадзел сьвету паміж буйнымі дзяржавамі. Царская Расія, у гэтай вайне мела гледжаньня павінен быць рашаючым задачу аслабіць і разьбіць моцнага палоўнага, асноўным у нацыянальнай праграме с.-д.».

Неабходнасьць змаганьня ў першую чаргу з шавінізмам і сацыял - шавінізмам вялікадзяржаўных нацый, прызнаньне гэтага змаганьня рашаючым, галоўным, асноўным у нацыянальнай праграме партыі найчыльнейшым чынам увязана з усёй бальшавіцкай настаноўкай пытаньня аб вайне, з знаньнем неабходнасьці змагацца ў сябе ў краіне супроць сваёй буржуазіі, з прызнаньнем неабходнасьці змагацца за паражэньне царскага ўраду ў імпэрыялістычнай бойні. Іменна ў эпоху імпэрыялістычнай вайны Ленін асабліва падкрэсьліваў неабходнасьць адрозьніваць нацыі прыгнятаючыя і прыгнечаныя. У палемыцы з Розай Люксэмбург па нацыянальным пытаньні, што разгарнулася ў гады вайны, Ленін рашуча змагаўся супроць недазаўсякі рэвалюцыйнага значэньня вызваленчага руху «малых» прыгнечаных нацый. Пярэчачы супроць высунутага Розай Люксэмбург палажэньня — «больш ня можа быць нацыянальных войн», Ул. І. пісаў: «гэта памылка вельмі шкодная: з яе выводзіць недарэчную прапаганду «разбраеньня», бо як быццам-бы ніякіх войн, апрача рэакцыйных, быць ня можа; з яе выводзіць ашчэ больш недарэчную і проста рэакцыйную абыякасьць да нацыянальных рухаў. Такая абыякасьць становіцца шавінізмам, калі члены эўрапэйскіх «вялікіх» нацый, г. зн. нацый, якія ўціскаюць масу дробных і калеяніяльных народаў, заяўляюць з нібыта кучоным выглядам: «нацыянальных войн больш быць ня можа!». Нацыянальныя войны супроць імпэрыялістычных дзяржаў ня толькі магчымы і імаверны, яны няўнікнёны і прагрэсіўны, рэвалюцыйны...» і г. д. (т. XIX, стар. 194).

Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі лёзунг права нацый на самавызначэньне набыў практычны зьмест. Партыя засталася, вядома, на тых-жа прынцыповых пазыцыях у нац. пытаньні, г. зн. асноўная ўстаноўка партыі — роўнапраўе і суверэннасьць нацый, прызнаньне права на аддзяленьне, адмаўленьне гвалту ў адносінах якіх-бы там ні было нацыянальнасьцей — засталася ранейшая. Але канкрэтны зьмест «гутарка ішла ўжо не аб змаганьні супроць нацыянальнай палітыкі царызму. На нарадах дня сталі пытаньне аб практычнай арганізацыі супраціўцца розных нацый пры дыктатуры пралетарыяту. Вырашэньне гэтай задачы партыяй цесна ўвязала са змаганьнем супроць перажытку мінуўшчыны, супроць спадчыны, пакінутай царской палітыкай нацыянальнага ўціску.

«Гэта спадчына», акрэсьлівае XII зьезд РКП(б), «заключаецца, па-першае, у перажытках вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца адлюстраваньнем былога прывілеяванага становішча вялікарускіх. Гэтыя перажыткі жывуць яшчэ ў галовах нашых савецкіх работнікаў, цэнтральных і мясцовых, яны сустракаюцца ў нашых дзяржаўных установах, цэнтральных і мясцовых; яны атрымліваюць падмацаваньне ў выглядзе «новых» замежнавехаўскіх вялікарускіх — шавіністычных веяньняў, якія ўсё больш узмацняюцца ў сувязі з нэпам. Практычна яны выяўляюцца ў пышліва - пагардлівых і бяздушна-бюракратычных адносінах рускіх савецкіх чыноўнікаў да пястач і патрэб нацыянальных рэспублік. Шматнацыянальная Савецкая дзяржава можа зрабіцца сапраўды моцнай, а супраціўніцтва народаў у ёй — сапраўды бракцкім толькі ў тым выпадку, калі гэтыя перажыткі будуць вытрачаны ў практыцы нашых дзяржаўных установаў рануча і цеперароткa. Становішча ў некаторых нацыянальных рэспубліках (Украіна, Беларусь, Азэрбайджан, Туркестан) ускладняецца тым, што значная частка рабочае клясы, якая зьяўляецца асноўнай апорай савецкай улады, належыць да вялікарускай нацыянальнасьці. У гэтых раёнах сувязь паміж горадам і вёскай, рабочай клясы і селяньствам сустракае вельмі моцную перашкоду ў перажытках вялікарускага шавінізму як у партыйных, так і савецкіх органах. У гэтых умовах гутаркі аб перавагах рускай культуры над культурамі больш адсталых народаў (украінскай, азэрбайджанскай, узбекскай, кірґіскай да інш.) ёсьць ня што іншае, як спроба замаскаваць панаваньне вялікарускай нацыянальнасьці. Таму рашучае змаганьне з перажыткамі вялікарускага шавінізму ёсьць першая чарговая задача нашай партыі».

Такім чынам, асноўны лёзунг партыі ў нацыянальным пытаньні — права нацый на самавызначэньне і да, і пасьля Кастрычніка, зьмяшчаў у сабе прызнаньне неабходнасьці змаганьня супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму. Ёсьць яшчэ і другі бок у гэтым пытаньні. Гэта — змаганьне супроць нацыяналізму і шавінізму ранейшых прыгнечаных царызмам нацыянальнасьцей, якое выпікае з прызнаньня права нацый на самавызначэньне. Адсюль — змаганьне бальшавікоў супроць культурна - нацыянальнай аўтаноміі Бунду, супроць раду іншых нацыяналістычных дробнабуржуазных партый. Мы ня спыняемся на гэтым моманце, каб не расшыраць рамак гэтага артыкулу.

Кожны раз, калі партыі трэба было ўлічыць зьмяніўшыяся суадносіны клясавых сіл, вырашаць новыя праблемы, зьвязаныя з разьвіцьцём і ростам рэвалюцыйнага руху, з зазнаньнем улады і яе ўтрыманьнем, і ў далейшым задачу пабудовы сацыялізму пры дыктатуры пралетарыяту, іншымі словамі, на кожным паваротце ад аднаго этапу да другога — перад партыяй паўставала нацыянальнае пытаньне. Гэта натуральна і няўнікнёна. «Нацыянальнае пытаньне ёсьць частка агульнага пытаньня пралетарскай рэвалюцыі, частка пытаньня аб дыктатуры пралетарыяту» (Сталін). «Нацыянальнае пытаньне ёсьць у істоце справы пытаньне сялянскае» (Сталін). Аснову нацыянальнага пытаньня становіць пытаньне аб узаемаадносінах пралетарыяту ў ліку іншых нацый да сялянства прыгнятаемай або раней прыгнятанай нацыян

Закрыўся 1-шы Ўсебеларускі зьлёт „25-тысячнікаў“

Арганізаваць ленінскі калгасны прызыў

заклікаюць „25-тысячнікі“ БССР, замацаваўшыя сябе на рабоце ў калгасах да канца пяцігодкі

Задача партыйных і савецка-грамадзкіх арганізацый—

НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ ПА ВЯРБОЎЦЫ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС У ЛЕНІНСКІ КАЛГАСНЫ ПРЫЗЫЎ

АСОАВІЯХІМАВЕЦ, ВУЧЫСЯ КОННАЙ СПРАВЕ!

ДАПАМОЖАМ КАЛГАСАМ ГАДАВАЦЬ ДОБРАГА КАНЯ

Райсаветы Асоавіяхіму павінны безадкладна ўзяцца за падрыхтоўку байцоў—коньніцы, павінны павесьці энэргічную работу ў галіне каняводзтва.

Стварэньне сэктараў коннай справы пры райсаветах — задача дня. З усіх раённых і гарадзкіх саветаў Асоавіяхіму толькі Магілеўскі, Лядьчыцкі, Караліншкі, Юраўіцкі і Гомельскі ўзяліся за конную справу. У гэтых раёнах нешта робіцца, работа разьвіваецца.

Іншыя раёны наогул пра конную справу забылі.

Гэты вучастак работы распадаецца на тры часткі: падрыхтоўка моладзі да службы ў коньніцы, перападрыхтоўка камандзнага складу запасу кавалерыі і артылерыі і конны спорт.

Падрыхтоўка моладзі павінна ісьці па шляху стварэньня кавалерыйскіх гурткоў на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах і ў навучальных установах.

Заняткі ў кавалерыйскіх гурткох вядуцца па праграмах, даных Цэнтральным Саветам Асоавіяхіму СССР для гурткоў I, II і III ступені.

Для навучаньня верхавой язьдзе ў гурткох **спадабіць** трэба ўвайсьці ў кантакт з часьцямі коньніцы і артылерыі, а таксама і з коннымі рэзэрвамі міліцыі.

Навучаньне язьдзе ў калгасах і саўгасах **павінна** на конях гаспадарак, якія заўсёды **могуць** даць некалькі коняй для гэтай мэты на гадзіну-дзьве ў вольныя ад работы дні.

У кожным саўгасе і калгасе заўсёды знойдзецца або камандзір запасу коньніцы, або **дамабілізаваны** чырвонаармец-кавалерыст, якія змогуць весьці заняткі.

У гарадзкіх інструктароў падшукаць **нічо нічай, бо** ў гэтай рабоце заўсёды **прымуць удзел** камандзіры кадру і запасу коньніцы і артылерыі, якія дасканала разумеюць усе важнасьць гэтай работы для абароны краіны.

Перападрыхтоўка камандзнага складу запасу **вядзецца** таксама шляхам стварэньня **гурткоў** на праграмах, спэцыяльна для гэтай мэты выданых ЦС Асоавіяхіму СССР.

Кавалерыйскія гурткі **завяцца** ў тойжа час **тымі** ячэйкамі, вакол якіх будзе разьвівацца і конны спорт.

Каняводзтва вяўляецца ў нас найбольш адсталым вучасткам сельскай гаспадаркі. Вялізнага значэньня каня як у гаспадарцы, так і для абароны краіны цяпер нельга адмаўляць.

Аднаводныя органы ўжываюць рад мерапрыемстваў, накіраваных на разьвіцьцё гэтай галіны гаспадаркі. У тойжа час на масцох, нават у некаторых раённых установах, да гэтага часу яшчэ не ўсьвядомлена ўся важнасьць каняводзтва. Разбазарваньне коняй яшчэ не спынена, а раёны слаба рэагуюць на гэта.

Сэктары коннай справы пры райсаветах Асоавіяхіму абавязаны неадкладна ўключыцца ў работу на каняводзтве.

Трэба павесьці шырокую растлумачальную кампанію сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў за спыненьне разбазарваньня коняй, за неабходнасьць гадаваньня і палапшэньня каня.

У той-жа час сэктары коннай справы павінны павесьці работу па ліквідацыі каняводнай няпісьменнасьці.

Трэба арганізаваць каняводныя гурткі ў калгасах і саўгасах. Такія-ж гурткі трэба стварыць у навучальных установах.

Зусім неабходна стварэньне каняводных (і кавалерыйскіх) гурткоў у такіх ВНУ, як вэт. інстытут у Віцебску і с.-г. акадэмія ў Горках. У гэтых ВНУ трэба дабіцца 100-процантнага ўдзелу студэнтаў у гурткох. Зрабіць гэта магчыма, бо ў рабоце гурткоў, зразумела, прымуць удзел усе навуковыя работнікі гэтых ВНУ.

У гэтым мы не сумняваемся, як не сумняваемся і ў тым, што ў рабоце сэктараў коннай справы, у рабоце каняводных гурткоў прымуць удзел і усе вэт дактары, зоатэхнікі і аграномы.

Раённыя саветы Асоавіяхіму і іх сэктары коннай справы павінны выканаць свой абавязак.

І яны яго выканаюць.

М.

Конныя сэктары—за работу

У рабоце Асоавіяхіму БССР ёсьць адзін **вучастак, на які** да гэтага часу мала звярталі ўвагу.

Гэты **вучастак** — конныя сэктары **абсалютна пустыя.**

Для **работы** конных сэктараў ёсьць неда**гэтага часу** у нас пытаньнем падрыхтоўкі **моладзі** для службы ў коньніцы не займаліся. У Беларусі моладзь коннай **справай** вусі. ня цікавіцца і не ніхто ў гэту работу ня ўцягвае. На гэту работу Асоавіяхіму РСФСР ужо даўно вьвярнуў увагу. У адной Маскве тысячы хлопцаў і дзяўчат з фабрык і заводаў прайшлі ўжо і праходзяць спэцыяльныя **курсы ў** манежах Асоавіяхіму.

Таксама **моладзі ў** БССР ня цікавіліся пытаньнем **масавага** спорту. Конны спорт разьвівае і **умацоўвае** ўвесь арганізм чалавека. **Конны спорт** мае вялікі ўплыў на разьвіцьцё **сьмельсьці** і вытрымасьці.

Нам **трэба** пакла заняцца пытаньнем перападрыхтоўкі **камандзнага** складу **коньніцы і артылерыі**, які, ідучы ў запас, **пераважае** з канём, што дзяжка адбіваецца на яго рабоце пры неабходнасьці зноў **вярнуцца** ў строй. Гэты недахоп **абазначаны** папаўняць конныя сэктары **Асоавіяхіму.** Ва многіх мясцох РСФСР **Асоавіяхіму** перападрыхтоўкай камсаставу, **якасу** заняўся вельмі сур'ёзна.

Конныя **сэктары** могуць і павінны адыграць **вялікую** ролю ў справе каняводзтва **БССР**, якая (справа) падае і колькасна **і якасна.**

Узьніць каняводзтва без сьвядомага ўдзелу калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас будзе надзвычай цяжка. Вось тут і павінны як раз прыйсьці на дапамогу НКЗ і **жывёлагадоўчая** кампэрацыя. Конныя **сэктары** Асоавіяхіму і сельскія ячэйкі **павінны** разгарнуць работу па коннай справе, **тысячным** чынам, сярод моладзі.

Неабходна растлумачаць вялікую важнасьць каняводзтва ў справе сельскай гаспадаркі і абароны краіны. Трэба **Украінаць** хаця-б элементарныя веды па **вялікаму** каню, правільнай **яго гадоўлі, утрыманьні**, карменьні і скарыстаньні.

Конныя **сэктары** могуць і павінны весьці **навучальную** работу як у галіне каняводзтва, так і ў галіне вынучэньня мэтаду і спосабаў гадоўлі і трэніраваньня каня, **асабліва** каня верхавога.

Ва **ўсіх** **значных** галінах у Беларусі ёсьць каму працаваць. Камандны склад **коньніцы** і артылерыі павінен гэтым заняцца, **ідучаючы** ўсямерна у гэту работу **радавых** чырвонаармеўцаў, перамеўнікаў і моладзь з фабрык, заводаў і вёскі.

Час **узяцца за** справу. Гэтага патрабуе наша сельская гаспадарка, гэтага **патрабуе абарона** краю.

Хаванскі.

Задача партыйных і савецка-грамадзкіх арганізацый—

НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ ПА ВЯРБОЎЦЫ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС У ЛЕНІНСКІ КАЛГАСНЫ ПРЫЗЫЎ

Сувязь „25-тысячнікаў“ з прадпрыемствамі

Даклад члена прэзыдыуму ЦКПСБ тав. **Плешакова** аб сувязі «25-тысячнікаў» з прадпрыемствамі і ўстановамі і аб далейшых задачах у гэтай галіне выклікаў гарачыя спрэчкі.

Выступаўшыя таварышы адзначалі станоўчыя факты адносін установаў, прадпрыемстваў да пытаньняў забесьпячэньня і дапамогі «25-тысячнікам».

Тав. **Кульвінскі** (Веткаўскі раён) адзначае, што «25-тысячнікі» тонуць у паперовых патоках. Сілы «25-тысячнікаў» выкарыстоўваюцца зусім нярацыянальна. Адразу-ж пасьля прыезду тав. Кульвінскаму розныя арганізацыі далі 7 нагрузак. «У выніку я зьяўляюся агентам раённых органаў, а не старшынёю і кіраўніком калгасу»,—кажа тав. Кульвінскі.

Цікавы факт аб адносінах раённых капэрацыйных арганізацый да пытаньня забесьпячэньня «25-тысячнікаў» ілюструе той-жа тав. Кульвінскі.

У Веткаўскі раён для 11-ці «25-тысячнікаў» было прыслана... 2 пары сандаляў і 2 пары брэзэнтавых пантофляў на зімовы час.

Сувязь з прадпрыемствамі вельмі слабая. Аб гэтым таварылі амаль усе дэлегаты зьлёту.

Тав. **Бабкоў** (Копыльскі раён) падае цікавы прыклад адносін прафарганізацый да сувязі з «25-тысячнікамі».

Калі тав. Бабкоў хацеў зрабіць справаздачу аб сваёй рабоце на заводзе «Вальшавік», які яго вылучыў, фабзаўком таставіў яго пытаньне пятнаццатым і даклад прышлося зрабіць у 3 гадзіны ночы.

Выступаўшыя дэлегаты адзначалі таксама **недапушчальнае затрыманьне зарплаты** «25-тысячнікам» **ня выплачвалі пэнсіі на працягу 5-ці месяцаў.**

***

Заўчора аб забесьпячэньні «25-тысячнікаў» зрабіў даклад старшыня Белкавпасаюзу тав. **Хаскін.**

Тав. **Гантман** ад імя ЦК перадаў прывітаньне зьлёту, спыніўшыся на далейшых задачах работы «25-тысячнікаў».

***

Учора зьлёт віталі прадстаўнікі рабочых заводу «Энэргія», «Камунар», «Труд», «Чырвоная армія» і шчотачнай фабрыкі.

***

Зьезд аднагалосна прымае пастанову аб замацаваньні ўсіх «25-тысячнікаў» на рабоце ў калгасах да канца пяцігодкі.

***

Пасьля прыняцьця рэзалюцый па ўсіх дакладах і заключнага слова тав. Міцькова, зьезд заканчвае сваю работу ў 2 гадзіны дня.

ЗАМАЦОЎВАЮЧЫ СЯБЕ НА РАБОЦЕ Ў КАЛГАСАХ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ, МЫ ЗЬВЯРТАЕМСЯ З ЗАКЛІКАМ ДА ЎСІХ «25-ТЫСЯЧНІКАЎ» САВЕЦКАГА САЮЗУ, ДА ЎСІХ, ХТО ВОЛЯЙ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ Ў ШТОДЗЕННАЙ ГЭРАІЧНАЙ БАРАЦЬБЕ ВЫРАШАЕ ГІГАНЦКУЮ ЗАДАЧУ, ПАСТАЎЛЕНУЮ ПАРТЫЯЙ, ЗАДАЧУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ: НЕАДКЛАДНА, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ, РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ РАБОТУ ПА ВЯРБОЎЦЫ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ МАС У ЛЕНІНСКІ КАЛГАСНЫ ПРЫЗЫЎ. Кожны «25-тысячнік» павінен стаць яшчэ больш актыўным дапаможнікам партыі і «Праўды» ў справе выкананьня пастаноў XVI зьезду і сьнежаньскага пленуму ЦК партыі. Кожны «25-тысячнік» павінен стаць актыўным арганізатарам ударных пастоў «Праўды».

Няхай жыве ленінскі ЦК і яго правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве ленінская «Правда»—арганізатар мас!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве ленінскі прызыў у калгасы!

„25-тысячнікі“ БССР—„Правде“

Першы беларускі зьлёт «25-тысячнікаў» горача вітае ленінскую «Правду», нястомнага барацьбіта супроць правага і «левага» ўхілаў і прыхільніцтва да іх, барацьбіта за генэральную лінію партыі, за высокія тэмпы індустрыялізацыі, за пяцігодку за чатыры гады, за суцэльную калектывізацыю, за ліквідацыю кулацтва на гэтай аснове.

Зьлёт запэўніе бальшавіцкую «Правду», што будзем рашуча змагацца з правым апартуністам як галоўнай небясьпекай, з «левымі» загібамі і скажэньнямі лініі партыі ў практычнай рабоце, са скажэньнямі ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Абавязуемся арганізаваць у кожным калгасе пасты «Праўды» і забясьпечыць бесьперапынны паток лістоў ЦО нашай партыі, свачасова сыгналізаваць аб усякіх скажэньнях лініі партыі. Побач з гэтым мы будзем дэманстраваць кожную крупіцу вопыту, лепшыя прыклады і ўзоры бальшавіцкай арганізацыі мас у барацьбе за калектывізацыю, за перавыкананьне пляну сяўбы.

Працягваючы пад непахісным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, выкарчоўваць рэшткі прышчэпаўшчыны, будзем рашуча выкрываць і змагацца з усімі тымі, хто свядмі апартуністычнымі наскокамі на бальшавіцкі план пасеўнай кампаніі тармозіць новы магутны калгасны прыплыў, з усімі, хто супрацьлівецца бальшавіцкім тэмпам, хто патурае кулаку замест рашучай барацьбы з ім і ліквідацыі яго на аснове суцэльнай калектывізацыі.

БЯЗЬЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБОЙ З АПАРТУНІЗМАМ за генэральную лінію партыі,

павысім клясавую баяздольнасьць гарадзкіх саветаў

ПАМЯТАЦЬ: „сапраўды актыўны ўдзел пралетарыяту і ўсёй масы працоўных у перавыбарах забясьпечыць на справе патрэбны зрух у перабудове работы саветаў і тым самым будзе важнейшым крокам у адносінах узьняцьця ролі саветаў у правядзеньні на практыцы ленінскай лініі партыі“.

З пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б).

Пад знакам росту актыўнасьці мас

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Справаздачна - перавыбарчая кампанія бабруйскага гарадзкога савету разгортваецца ва ўмовах росту палітычнай актыўнасьці мас.

Вынікі першых 10 дзён перавыбараў даюць наступны малюнак: яўка на сходы дасягае ў сярэднім 90 проц., некаторыя сходы зацягваюцца на 5-7 гадзін. У ажыўленых спрэчках па дакладах бярэцца пад агонь самакрытыкі ўся работа гарадзкога савету.

— ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ, РАШУЧА ПАЛЕПШЫЦЬ РАБОЧАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ — патрабуюць выбаршчыкі ад гарадзкога савету.

Па 43 сходах унесена звыш 500 практычных дадаткаў да наказу.

На гэтых-жа сходах у спрэчках выказалася каля 500 чал., задана 1.200 пытаньняў.

За першую дэкаду перавыбараў выбран у гарсавет 41 чал., з іх 25 проц. жанчын.

З выбраных — 80 проц. рабочых ад варштату, 56 проц. ударнікаў, 46 проц. членаў КП(б)Б, 14 проц. камсамольцаў і 40 проц. беспартыйных. Склад гарсавету абноўлен на 86 проц.

У часе перавыбараў створаны 3 новыя ўдарныя брыгады імя гарсавету. На швэйнай фабрыцы падана 15 заяў у партыю, на камбінаце — 4, у транспартнікаў — 5.

А. М.

Лепшых ударнікаў —у гарсавет

Завод «Ударнік» энэргічна рыхтуецца да падыходзячых перавыбараў менскага гарадзкога савету. На сёньняшні дзень ужо сабрана 70 прапаноў рабочых да наказу. На цэхах абгаворваюцца кандыдатуры дэпутатаў заводу «Ўдарнік» у гарадзкі савет. Сярод іх лепшыя ўдарнікі — Надзя Мурэйс, якае мае 13-гадовы вытворчы стаж, Гітлін — 12-гадовы вытворчы стаж і г. д.

За час справаздачна-перавыбарчай кампаніі 8 ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Л.

Распушчана шклоўская выбарчая камісія за апартуністычную практыку і скажэньні лініі партыі

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Перавыбары гарадзкога савету перанесены на 16 студзеня з прычыны таго, што гарадзкая выбарчая камісія ня здолела арганізаваць рабочую масу вакол кампаніі, праявіла яўна правааапартуністычную недаацэнку перавыбараў.

Ніякай падрыхтоўкі не праводзена; кампанія ўвесь час праходзіла самацёкам. Выбарчая камісія ні разу не сабралася, каб разгледзець сьпісы выбаршчыкаў; лічбы проста браліся са столі. Ня ўлічана каля 2 тыс. працоўных, якія, такім чынам, пазбаўлены права выбіраць у савет.

Паводле пляну раскладкі дэпутатаў у гарадзкім савеце павінна быць больш прадстаўнікоў ад неарганізаванага насельніцтва, чым ад рабочых гораду.

Тэзісы справаздачы гарадзкога савету носяць яўна правааапартуністычны характар, яны не мабілізуюць мас выбаршчыкаў на выкананьне генэральнай лініі партыі. У тэзісах няма ні слова аб тым, як гарсавет змагаўся за лінію партыі, не закранута пытаньне аб барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з нацыянал - дэмакратызмам і шавінізмамі іншых колераў. Затое можна прачытаць у справаздачы, што Шклоў зьяўляецца горадам самаахвярна адданы генэральнай лініі партыі і патрабуюць бязьлітаснай барацьбы з усякімі ўхіламі ад лініі.

З-за правааапартуністычнай практыкі выбарчай камісіі 16 студзеня сарваліся ўсе перавыбарчыя сходы.

Бюро райкому КП(б)Б і райКК у сваёй пастанове па дакладу выбарчай камісіі адзначылі, што ГАРАДЗКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ НЯ ЗДОЛЕЛА АРГАНІЗАВАЦЬ МАСЫ ВАКОЛ ПЕРАВЫБАРАЎ, ПРАЯВІЛА ПРАВЫ АПАРТУНІЗМ НА ПРАКТЫЦЫ. Складаньне пляну выбараў, які прадугледжвае перавагу ў гарсавеце прадстаўнікоў неарганізаванага насельніцтва над рабочымі дэпутатамі (у той час, калі там ёсьць вялікая фабрыка і рад іншых, прадпрыемстваў), зьяўляецца самым грубым і абураючым парушэньнем дырэктыў партыі.

Тэзісы справаздачы зьяўляюцца дзяляцкім, апартуністычным дакументам.

Бюро пастанавіла: РАСПУСЬЦІЦЬ ГАРАДЗКУЮ ВЫБАРЧУЮ КАМІСІЮ, СТАРШЫНЮ КАМІСІІ І ГАРСАВЕТУ —ТАВ. ГРАБЯНЬКОВА ЗЬНЯЦЬ З РАБОТЫ І АБВЯСЬЦІЦЬ ЯМУ ВЫМОВУ.

Ян.

Рабочыя акраіны—па-за ўвагай гарсавету

У другі раз сабраліся на справаздачны сход Менгарсавету работнікі кіраўніцтва сувязі, Белрадыёцэнтру і рабочыя пабудовы аўтаматычнай тэлефоннай станцыі. Калі першы раз яўка на сход складала ня больш 50 проц., дык другі раз сабралася амаль 100 проц.: з 168 чал. прышло 150.

Спрэчкі на дакладу прадстаўніка гарсавету закранулі ўсе бакі работы савету. Асабліва шырока сышыліся выступаўшыя на пытаньні рабочага забесьпячэньня і дзейнасьці каапэрацыі. Як і на іншых сходах, адзначана: **гарсавет стаяў у баку ад рабочага забесьпячэньня, ён мала клапаціўся аб ліквідацыі прарываў у ластаўцы дроў і гародніны.** Дагэтуль не ліквідавана чарга ў крамах і сталоўках. Хлебаабвод усё яшчэ выпускае недобракасную прадукцыю.

Многа гаварылі аб **добрабыце гораду.** Гарсавет мала ўвагі аддае рабочым акраінам. На радзе вуліц няма сьвятла, няма бруку. Увосень і вясной на акраінных вуліцах непраходная грязь. Жыллаапэрацыйнае таварыства «Сувязь» трымае ў сябе гаданы вялікія сродкі і не выкарыстоўвае іх на жыллёвае будаўніцтва. У горадзе адчуваецца вострая патрэба ў крамах. Зусім ненармальна, калі бялізну мыюць на 2 і больш месяцаў. Гаварылі і аб пераборах у трамвайным руху якраз тады, калі трэба ісьці на работу, трамвайны рух спыняецца, не даюць току, і рабочым прыходзіцца ісьці пехатой.

Нарэшце, дэпутаты гарсавету вельмі дрэнна зьвязаны з прадпрыемствамі, амаль ніколі не дакладваюць выбаршчыкам аб сваёй рабоце. На сходзе выбрана камісія з 9 асоб для складаньня наказу новаму гарсавету.

ШЛЯНЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ—

НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА КАЛГАСУ І ВЁСКІ

МНОГІЯ РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕДААЦЭНЬВАЮЦЬ ЗНАЧЭНЬНЯ ПЛЯНУ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ РЭКАНСТРУКЦЫЮ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

МАБІЛІЗАЦЫЯЙ ШЫРОКІХ МАС КАЛГАСЬНІКАЎ--БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ ВАКОЛ ЗАДАЧ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПОСЬПЕХ ВЕСНАВОГА НАСТУПЛЕНЬНЯ

Адказьнейшы вучастак

Складаньне вытворчых пляноў правядзеньня с.-г. кампаніі 1931 г. зьяўляецца адказьнейшым вучасткам барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю вёскі.

У гэтым годзе—трэцім рашаючым годзе пяцігодкі—складаньне вытворчых калгасных пляноў набывае асаблівае значэньне. **У абмеркаваньні іх павінны прыняць шырокі ўдзел самі калгасныя масы.** Каб узьняць сваю гаспадарку на вышэйшую ступень, калгаснікі пры складаньні пляноў павінны скарыстаць накоплены імі вопыт калектыўнага гаспадараньня і арганізацыю працы ў часе мінулых с.-г. кампаній.

Ад свачасовага давядзеньня пляну да калгасу, абмеркаваньня яго самімі калгаснікамі і вызначэньня каляндарных пляноў падрыхтоўкі да сяўбы—будзе залежаць посьпех другой калгаснай вясны.

Весткі, атрыманыя намі з розных раёнаў, сьведчаць, што з гэтай справай у нас ня ўсюды добра.

Паводле партыйных і ўрадавых дырэктыў, пляны веснавой с.-г. кампаніі ўжо даўно павінны былі быць даведзены да кожнага калгасу і пасобнага бядняцка-серадняцкага двара. Мін тым ва многіх раёнах пляны загрузьлі ва ўстановах.

Гэта гаворыць аб яўнай **правапартуністычнай недаацэнцы значэньня плянавага пачатку для сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі** з боку ряду раённых арганізацый. Прыкладам апартунізму на практыцы ў галіне падрыхтоўкі да сяўбы могуць паслужыць такія раёны, як **БРАГІНСКІ,** дзе пляны веснавой кампаніі не пасунулися далей рай-калгасаюзу. **У ТУРАЎСКІМ** раёне ня складзены пляны збожжавачысткі; пра кантрактацыю таксама забылі. **Халопеніцкі** райвыканком, які даўно пляны да сельсаветаў, не праверыў, як яны праводзяцца ў жыцьцё.

Трэба павесьці рашучую барацьбу з гэтымі апартуністычнымі стаўкамі на самацёк, са спасыланьнямі на «аб'ектыўныя» прычыны, з паказаньнямі на тое, што... «да вясны далёка—пасьпеем».

Трэба забясьпечыць сапраўдную бальшавіцкую падрыхтоўку да вясны як у калгасным, так і ў індывідуальным сэктары.

Далейшае наступленьне на капіталістычныя элементы вёскі, барацьба за сацыялістычную рэканструкцыю і спэцыялізацыю сельскай гаспадаркі патрабуюць свачасовага выкананьня мерапрыемстваў, вызначаных партыяй і ўрадам.

Абмен гатунковага аўса

СКОНЧЫЦЬ ДА 1-га САКАВІКА

Паводле кантрольных лічбаў плошча гатунковага аўса на БССР у 1931 годзе павінна быць пашырана на 61 тыс. гэкт. На пашыраную плошчу патрэбна каля 16.200 тон насеньня. Загатоўка гэтай колькасьці зусім магчымая, калі-б пашы арганізацыі свачасова яе пачалі.

Да апошняга часу на загатоўчыя склады паступіла вельмі нязначная колькасьць гатунковага аўса, у параўнаньні з загатовак. Абмен звычайнага аўса на гатунковы зусім не пачаты. Такія раёны, як **Лядзянскі, Сурскі і Бешынковіцкі,** не загатовілі нават ніводнага кілёграма гатунковага насеньня.

Тлумачыцца гэта выключна недаацэнкай раённымі арганізацыямі гэтага мерапрыемства. У раёнах не пялося дакладнага ўліку—дзе і колькі апрабавана насеньня. Раёны ня былі забясьпечаны звычайным аўсом для выдачы калгасам у абмен на гатунковы, у выніку гатунковы авёс часта ідзе на корм жывёле.

Затрыманьне з абмалотам збожжа ў калгасах таксама дрэнна адбілася на наступленьні гатунковага насеньня. У некаторых калгасах на сёньняшні дзень усё яшчэ не абмалочана 50-60 процантаў збожжа.

Замест таго, каб мабілізаваць унутрыгаўдзенныя рэсурсы, арганізаваць у калгасах ударныя брыгады на абмалоце, утварыць апрабацыю і забясьпечыць раён гатунковым насеньнем, некаторыя райкамгасаюзы прысылаюць заяўкі на завоз насеньня аўса.

Вось на такіх яўна апартуністычных настроях трэба зараз-жа рашуча ўдарыць. Неабходна безадкладна разгарнуць абмен звычайнага аўса на гатунковы як у калгасах, так і ў індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарках.

Шаўнуноў.

Сустрэчным плянам

скароцім тэрміны падрыхтоўкі

Саўгасы „Сьвінавода“— у паход за 12 таварных сьвіней

Перад саўгасамі «Сьвінавода» пляны веснавой с.-г. кампаніі 1931 году высоўвае рад адказьнейшых задач. Пасьўная плошча саўгасаў павінна быць патроєна таксама, як і рабочая сіла. Пачная гаспадарка патрабуе поўнай рэарганізацыі.

Матар'ялы частка дырэктараў саўгасаў і сакратароў камсамольскіх ячэек, а таксама весткі з месц сьведчаць, што многія рабочыя калектывы ўжо не пачалі рыхтавацца да другой бальшавіцкай вясны.

Саўгасы «Велень-Сіньча», «Сталіна», «Будзёнавец», «Вызваленьне», «Негарэлае», «Шыкатавічы» і інш. ягно ня скончылі абмалот збожжа. У сувязі з гэтым зрываецца план перавозкі насеньня ў іншыя саўгасы.

Тоўкі перадавыя саўгасы, як «Бабінічы» і «Боркі-Бялевічы» поўнасьцю скончылі рамонт с.-г. інвэнтару. Большасьць-жа чамусьці адкладваюць гэту работу на позьнюю вясну.

Барацьба за навышэньне ўраджайнасьці, за пашырэньне пасеўаў бульбы патрабуе максімальнага скарыстаньня мясцовых угнаеньняў, асабліва збору попелу. Праверка паказала, што ў значнай колькасьці саўгасаў збор і хаваньне попелу неарганізаваны.

Каляндарны план падрыхтоўчых работ, вызначаны партыяй і ўрадам, на можа быць парушан. **Наадварот, саўгасы «Сьвінавода» шляхам складаньня сустрэчных пляноў павінны скараціць вызначаныя тэрміны.**

Абмалот насеньня трэба перавесьці на некалькі зьмен, каб скончыць яго ў бліжэйшыя тэрміны. Неабходна самым ударным чынам ці... рамонт машын і збор мясцовых угнаеньняў.

Цэнтральная задачай саўгасаў «Сьвінавода» зьяўляецца **зацяпленьне кліпоў і захоўваньне апарасаў да вясны.**

У паход за 12 таварных сьвіней, пачаты саўгасамі «Бапоні» «Нясята» і «Вішнёўка», павінны ўключыцца ўсе саўгасы «Сьвінавода». Ня меншае значэньне мае эканомія ў выдаткаваньні кармоў і стварэньні кармовай базы.

Вярбоўка патрэбнай рабочай сілы таксама зьяўляецца важнейшым зьвяном падрыхтоўчай работы. Саўгасы сельгас рабочых і органы Наркампрацы павінны дапамагчы саўгасам «Сьвінавода» ў вярбоўцы батрацкіх кадраў. Камсамол павінен паслаць свае брыгады для арганізацыі камсамольскіх цэхаў на ўсіх галінах сьвінагадоўлі. Саўгасы і каапэрацыйныя органы на масцох у сваю чаргу павінны забясьпечыць стварэньне належных бытавых умоў для новых кадраў.

Аўчынлікаў.

Пляны веснавой сяўбы

загрузьлі ў... папках раённых устаноў і сельсаветаў

(Паводле лістоў рабселькораў)

1-ае сьнежня было апошнім тэрмінам дарэдзеньня пляну веснавой с.-г. кампаніі 1931 году да асобных калгасаў і бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. Ад свачасовага дарэдзеньня гэтых пляноў да калгасных і бядняцка - серадняцкіх мас вёскі залежыць пасьпяховая падрыхтоўка да сяўбы.

Між тым, нашы сялькоры ў сваіх допісах сыгналізуюць нам, што ў радзе раёнаў значэньна марудзяць з правядзеньнем гэтага важнейшага мерапрымства.

— **БРАГІНСКІ РАЙКАЛГАССАЮЗ,** — паведамляе тав. **Молат,** — усё яшчэ ніяк ня можа зацьвердзіць пляны веснавой с.-г. кампаніі. Пляны, атрыманы з Белкалгасцэнтру, так і загруз у райкалгасаюзе. У выніку падрыхтоўка да сяўбы ў калгасах яшчэ не распачалася.

У **ТУРАЎСКІМ** раёне, як паведамляе сялькор **Папянскі,** яшчэ ня складзены пляны аўчысткі збожжа. Праверка гатункоасьці насеньня таксама па рабоце. Нічога ня зроблена і ў сэнсе складаньня пляну кантрактацыі насеньня і жывёлы. Раённыя ўсталовы спадзяюцца на завоз насеньня, **самі-ж нічога ня робяць, каб загатовіць насеньне на месцы,** каб мабілізаваць свае ўласныя рэсурсы.

На ст. **Жыткавічы** с.-г. машыны замяло сьнегам, звыш 5 тон угнаеньня разьнесена ветрам.

Нельга не падкрэсьліць і яўна апартуністычнай недаацэнкі значэньня тэхнічных культур на ўмовах БССР з боку Тураўскага райвыканкому. Райвыканком ігнаруе дырэктыву Наркамаему аб пашырэньні плошчы канапель і ячменю. Наадварот, пляны, якія складаюцца райвыканкомам, **прадугледжваюць зьмяншэньне плошчы гэтых культур** у параўнаньні з дырэктывамі ўраду.

Яшчэ 7 сьнежня «Зьвязда» сыгналізавала аб нездавальняючай рабоце **ХАЛОПЕНІЦКІХ** раённых зямельных арганізацый у галіне падрыхтоўкі да сяўбы. Ня гледзячы на гэта, становішча накуль што не палепшылася. Пляны веснавой сяўбы,—піша сялькор «Эдь», — **ляжаць у папках сельсаветаў.** Ні адна вёска ня ведае пра гэтыя пляны. Рамонт машын у раёне не распачаты. Як калгасы, так і індывідуальныя бядняцка - серадняцкія гаспадаркі чагосьці чакаюць. Кузьні-ж зараз ня маюць чаго рабіць.

Спажывецкае таварыства павінна арганізаваць у гэтым годзе малочна-гародную фэрму, але покуль што канкрэтнага нічога ня зроблена.

— У **КРУПСКІМ** раёне ў галіне падрыхтоўкі да сяўбы, — піша сялькор **«Вачавідзец»,** — панує яўна правааапартуністычны самацёк. Падрыхтоўка да сяўбы яшчэ не распачата. Пляны кампаніі няма ні ў калгасах, ні ў індывідуальным сэктары. Да васьмі насенных фондаў ня прыступлена. Ня лепш і з рамонтам інвэнтару.

У **ЧЫРВОНАЛУЦКІМ** сельсавеце бядняцка - серадняцкая частка сялянства рашуча ўступіла на шлях калектывізацыі сельскае гаспадаркі. **25% ГАСПАДАРАК СЕЛЬСАВЕТУ УСТУПІЛІ Ў КАЛГАСЫ.** 4 калгасы арганізаваліся ў часе асенняй сяўбы. Зараз у сельсавеце ўжо ёсьць 10 калгасаў. Але-ж працоўны энтузіязм бядняцка - серадняцкіх мас вёскі,—піша сялькор **«С.»,** не сустракае адпаведнай дапамогі з боку аграномаў і зямельных органаў. Так, кармавы балянс на калгасах яшчэ ня складзен; няма і пляну пасеўнай кампаніі. Агранам **Пятакоў** увесь час сядзіць дома і не наведаў ніводнага калгасу.

ЧЫРВОНААЗЁРСКІ сельсавет, Старобінскага раёну зусім не клапоціцца аб тым, каб пусьціць на ноўны ход трыеры. Збожжаачышчальныя машыны зусім не нагружаны; да збору попелу таксама ня прыступлена.

Прыведзеныя вышэй факты сьведчаць, што рад раёнаў недаацэньваюць значэньня свачасовага давядзеньня пляну да кожнага калгасу, да кожнага бядняцка - серадняцкага двара. Трэба зараз-жа абвясьціць бязьлітасную вайну гэтаму яўнаму апартунізму на практыцы.

З „ЗЬВЯЗДА“ № 16

АДКРЫЛІСЯ РАЕННЫЯ ЗЬЕЗДЫ САВЕТАЎ

Па БССР

Мэдпэрсанал слаба змагаецца з эпідэміяй шкарлятыны

КОХАНАВА. У м. Смаляны выбухнула эпідэмія шкарлятыны. Да апошняга часу зарэгістравана 25 хворых. На шкарлятыну хварэюць ня толькі дзеці, але і дарослыя. Мясцовы лекавы пункт не падрыхтаваны да барацьбы з эпідэміяй.

Мэдычны пэрсанал нядбайна адносіцца да барацьбы са шкарлятынай. Ня гледзячы на тое, што ў некаторых дамох на шкарлятыну хварэюць цэлыя сем'і, якім патрэбна тэрміновая дапамога, фэльчар Саляжынскі толькі два дні ў тыдзень працуе на пункце, а ўвесь астатні час праводзіць дома — 16 кілёметраў ад месца службы.

Загадчык лекавага пункту доктар Гофман да апошняга часу не паведаміў РВК аб эпідэміі ў Смалянах і ня ўжыў ніякіх захадаў да больш рашучае барацьбы з шкарлятынай. Гофман адмовіўся аказаць хуткую дапамогу адной калгасьніцы і толькі пасьля катэгарычнай прапановы старшыні сельсавету выехаў у калгас.

Прэзыдыму Коханаўскага РВК, які засядаў у м. Смалянах, прапанаваў раінспэктарыяту аховы здароўя ўзмацніць Смалянскі лекавы пункт на час эпідэміі дадатковым мэдычным пэрсаналам і ўжыць цэлы рад арганізацыйных мер па аздараўленьні Смалянскага лекавага пункту.

Абураючая безгаспадарчасьць

АСІНБУД. (Наш кар.). Капя двох месяцаў назад на Асінбуд было завезена 25 вагонаў бульбы, вызначанай для бровару саўгасу ВЫСОКАЕ (Аршанскі раён). Ня гледзячы на тое, што адпегласьць ад Асінбуду да бровару—усяго 5 кілёмэтраў, бульба дагэтуль не адвезена на месца прызначэньня.

У выніку бульба занесена сьнегам і памерзла. Зараз па ёй нават пратоптаны праязныя дарогі.

Купкі выкарыстоўваюць гэты факт для шалёнай агітацыі супроць загатовак. Трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у гэтай злачынной безгаспадарчасьці, якая мяжуе са шкодніцтвам.

Бюракраты з Менскага вузла чыгункі

Купіўшы білет на ст. Менск, нельга быць упэўненым, што паедзеш з Менску тым цягнікам, на які куплены білет. Галавацяпы з Менскага вузла моцуць прымусіць пасажыра чакаць цягніка некалькі дзён. Так, іменна стаяла справа 7 студзеня, з дзесяткамі пасажыраў, якія ехалі ў напрамку Фаніпаля.

Я купіў білет на цягнік, які адыходзіць з Менску ў 18 г. 10 х. Падыходжу да выхаду на пасадку.

— Стой—сыпыне мяне кантралёр.

— Як, чаму?

— Вагоны перапоўнены, паедзеце з чарговым цягнікам.

Тут-жа вартаўнік, што стаяў побач з кантралёрам вырваў у мяне з рук білет і перадаў кантралёру, загадаўшы не зварачаць білета пакуль не адойдзе цягнік.

У чым тут справа?

З прыгарадных станцый (Койданава, Фаніпаль і інш.) у Менск штодзенна едуць мяшочнікі для таго, каб збыць на дарагой цане сёе-тое з прадуктаў харчаваньня. Мяшочнікі, калі скажам едзе з Койданава ў Менск на адзін дзень купляе зваротны білет (да Менску і назад у Койданава). Гэтага работнікі станцыі ня улічваюць і ў выніку... перапоўненыя вагоны.

Старэйшы дзяжурны памочнік начальніка станцыі нават не хацеў мяне і выслухаць:

Паедзеце наступным цягнікам.

Ён рашуча адмовіўся назваць сваё прозьвішча, заявіўшы: «вы на мяне скаргіцца ўзлумалі, я не павінен кожнаму называць сваё прозьвішча». Адмовіўся назваць прозьвішча і кантралёр.

Толькі праз работніка ДПУ ўдалося устанавіць прозьвішча памочніка начальніка станцыі і кантралёра. Першы —Папковіч, другі—Пакроўская.

Адведныя арганізацыі павінны зацікавіцца работай Менскага чыгуначнага вузла.

О. ПАЎЛЮЦ.

Падрыхтоўка да лесасплаву

СНК БССР запрапанаваў Лесбелу скончыць падрыхтоўку да сплаву не пазьней і сакавіка. Наркамгандлю і Белкаапсаюзу даручана забясьпечыць выкананьне заявак Лесбелу на прадукты і прамтавары паводле ўстаноўленых норм і завесьці гэтыя прадукты і прамтавары на сплаўныя пункты не пазьней і сакавіка бяг. году. СНК даручыў Лесбелу разгарнуць работу па мэханізацыі сплаву і выгрузкі лесу.

Наркампраны запрапанавана свалачасова забясьпечыць сплаў патрэбнай колькасьцю рабочай сілы, а таксама спэцыялістамі—гідра-тэхнікамі.

„Працуйце як умееце"

Вынікі праведзенага ў Брагінскім раёне агляду работы вылучэнцаў і 25-тысячнікаў паказалі, што з боку работнікаў раённых устаноў і паасобных партячэек наглядаюцца няўважлівыя адносіны да вылучэнцаў. Няма належнай дапамогі вылучэнцам і клопату аб стварэньні сырыяючых умоў для іх работы.

Прысланых у раён вылучэнцаў на работу ў якасьці фініспэктароў, загадчык грашовай часткі РВК сустрэў бюракратычна. Паказаў ім сталы, шафу, даў паперы і заявіў: «Працуйце як умееце, а вучыць вас мне няма часу».

У такіх умовах вылучэнцы адчуваюць сябе маральна прыгнечанымі, ня маюць упэўненасьці ў карысьці сваёй работы.

Паасобныя вылучэнцы не спраўляюцца са сваімі абавязкамі таму, што яны перагружаны заданьнямі па іншых галінах работы. Напрыклад, т. Куняўскі, прызначаны інструктарам райкаапсаюзу, ужо 4 месяцы лічыцца па гэтай пасадзе, але да сваёй непасрэднай работы яшчэ не прыступіў і толькі выконвае нарыядычныя заданьні раённых работнікаў. Няправільна скарыстоўваюцца на рабоце і некаторыя 25-тысячнікі. Райкалгасаюз нічога не зрабіў, каб дапамагчы 25-тысячнікам у павышэньні іх ведаў па сельскай гаспадарцы. Большасьць парт'ячэек і райком КП(б)Б ня цікавіліся ўмовамі і станам работы вылучэнцаў. Нічога ня зроблена партарганізацыяй для падрыхтоўкі кадраў з батракоў, беднякоў і калгасьнікаў.

Пасьля такіх вынікаў Брагінская раённая партарганізацыя павінна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на задачы вылучэнства і стварэньне адпаведных умоў у рабоце вылучэнцаў і 25-тысячнікаў.

МОЛАТ.

Ва ўмовах апартуністычнай недаацэнкі

ЖЛОБІН. (Наш. кар.). Як ужо адзначалася ў друку, справаздачная кампанія гарсавету ў Жлобіне праходзіць ва ўмовах апартуністычнай недаацэнкі кампаніі. Прафэсіянальныя арганізацыі дрэнна падрыхтаваліся да перавыбараў. Нідзе—ні ў горадзе, ні на станцыі не адчувацца, што зараз адбываецца кампанія перавыбараў. Яўка на сходы не перавышае 50 проц., шмат сходаў сарвана, перанесены на другі дзень. Дрэнна праведзена падрыхтоўка і на Жлобінскім вузле чыгункі, дзе парт-арганізацыя і станцыйны камітэт не аддалі належнай увагі перавыбарам гарсавету.

Павінны быць прыняты самыя рашучыя меры, каб актывізаваць ход справаздачна - перавыбарчай кампаніі, інакш ня будзе дасягнута асноўная мета перавыбараў гарсавету — мабілізаваць масы выбарчыкаў вакол выкананьня важнейшых задач пэрыяду сацыялістычнай рэканструкцыі, вакол ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі.

Да сяўбы ня рыхтуюцца

ПАРЫЧЫ. Падрыхтоўка да надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі на Парыцкім раёне праходзіць вельмі дрэнна. Райза займаецца «очковтирательством». Лічбы, пасланыя ім у Наркамзем, не адпавядаюць сапраўднасьці. Ні адна з раённых арганізацый не падрыхтавалася да рамонту с.-г. інвэнтару. Бязьдзейнічаюць і камітэты сялянскай узаемадапамогі. Сэмна насельня праходзіць марудным тэмпам.

Спэцкор.

Зьезды праходзяць пад знакам новага калгаснага прыбою, арганізацыі чырвоных абозаў, выкананьня плянаў загатовак

Новыя калгасы імя зьездаў саветаў

ЛЁЗНА, 16. (Наш кар.). 15 студзеня адкрыўся VI зьезд саветаў Лёзьненскага раёну.

Калгасьнікі, беднякі і сераднякі-адзіначасобнікі ў падарунак зьезду саветаў арганізуюць чырвоныя абозы. У першы дзень пасяджэньня зьезду прыбыло 20 абозаў з 325 фурманкамі, з якіх 105—фурманак калгасьнікаў. Усяго чырвонымі абозамі здана збожжа 54 тоны, ільну—9 тон, іншых культур—14 тон.

Да адкрыцьця зьезду арганізавана 2 новых калгасы з 64 гаспадаркі.

Да 6 зьезду саветаў Лёзьненскі раён калектывізаваны па гаспадарках па 18 проц., па ворнай плошчы—па 23. Пляны загатовак выкананы: па збожжы—па 120 проц., ільне—па 66 проц., ільпанасеньні—па 93 проц. і г. д.

Шосты Вушацкі

ВУШАЧЫ. 16. (Наш кар.). 15 студзеня адкрыўся VI зьезд саветаў Вушацкага раёну. Ва ўступным слове старшыня райвыканкому адзначыў дасягненьні раёну ў сацыялістычным будаўніцтве за пэрыяд з V да VI зьезду.

У прэзыдыум выбрана 24 чал. Пад гучныя воплескі зьезд выбірае ў ганаровы прэзыдыум палітбюро ЦК УсеКП(б).

Пасланы прывітальныя тэлеграмы т. т. Сталіну, ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б, ЦВК і СНК СССР і БССР.

Сёньня раніцаю зьезд заслухаў даклад ураду БССР.

Расьце калгасны прыліў

КАПЫЛЬ. (ПА ТЭЛЕФОНУ АД НАШ. КАР.) 15 СТУДЗЕНЯ Ў 6 ГАДЗ. ВЕЧ. АДКРЫЎСЯ VI РАЁННЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ КАПЫЛЬШЧЫНЫ.

У ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЕЗДУ ВЫБРАНЫ 17 ЧАЛАВЕК. У ГАНАРОВЫ ПРЭЗЫДЫУМ ВЫБРАНА ПАЛІТБЮРО ЦК УсеКП(б), БЮРО ЦК КП(б)Б, ЦК КАМПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ і т. т. АНДРЭЕЎ і КАЛНІН.

У БЫСТРЫЦКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ АРГАНІЗОВАН НОВЫ КАЛГАС ІМЯ VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ КАПЫЛЬШЧЫНЫ З 12-ЦІ ГАСПАДАРАК, У ДОКТАРАВІЦКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ — КАЛГАС «ІСКРЫ ІЛЬЛІЧА» З 16 ГАСПАДАРАК.

РАБОЧЫЯ РАЁННАГА КАМБІНАТУ СКОНЧЫЛІ ПАБУДОВУ НОВАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ Ў БАВАЎНЯНСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ. СТАНЦЫЯ ПУШЧАНА У ХОД.

З УСІХ КУТКОЎ РАЁНУ ЗЬЕХАЛІСЯ ДЭЛЕГАЦЫІ КАЛГАСАЎ ВІТАЦЬ ЗЬЕЗД.

ЗЬЕЗД ПАСЛАЎ ПРЫВІТАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ т. т. СТАЛІНУ, МОЛАТАВУ, РВС, ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР.

З ДАКЛАДАМ АБ РАБОЦЕ ЎРАДУ БССР ВЫСТУПІЎ НАРОДНЫ КАМІСАР ПРАЦЫ БССР тав. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Хваляюць дзейнасьць ураду БССР

ВАЛЫНЕЦ, 16. (Наш кар.). Учора адкрыўся зьезд саветаў Валынецкага раёну. Зьезд заслухаў даклад тав. НЕКРАШЭВІЧА аб дзейнасьці ўраду БССР. Дэлегаты актыўна абгаварваюць даклад ураду. Усе прамоўцы ў спрэчках аднадушна ухваляюць дзейнасьць ураду.

Чырвоныя абозы—у падарунак зьезду

ДРЫБІН, 16. (Па тэлефону ад наш. кар.). Учора, у 6 гадзін вечара адкрыўся 6 зьезд саветаў Дрыбінскага раёну.

У ганаровы прэзыдыум зьезд абраў т. т. СТАЛІНА, МОЛАТАВА, АРДЖАНІКІДЗЭ, ВАРАШЫЛАВА, КАЛІНІНА, РУДЗУТАКА, КАГАНОВІЧА, АНДРЭЕВА, ГЕЯ, ТЭЛЬМАНА, ШАРАНГОВІЧА і ГАЛАДЗЕДА. Зьезд аднагалосна зацьвердзіў наступны парадак дня: справаздача ўраду БССР; справаздача раённага выканаўчага камітэту; даклад аб веснавой пасеўкампаніі; даклад аб пэрспэктывах культурнага будаўніцтва; зацьвярджэньне каштарысу; выбары райвыканкому.

Дрыбінскі раён мае вялікія посьпехі на фронце калектывізацыі і культурнага будаўніцтва. Лік калгасаў па раёне павялічыўся да 32 супроць 13 у мінулым годзе. Пашырылася школьная сетка: адкрыты новыя тры сямігодкі (з іх адна яўрэйская). Узмоцнена работа па антырэлігійным і інтэрнацыянальна-клясавым выхаваньні працоўных мас.

У шматлікіх прывітаньнях зьезду працоўныя масы Дрыбіншчыны абяцаюць аддаць усю энэргію для справы сацыялістычнага будаўніцтва. Калгасьнікі, беднякі і сераднякі, у адказ шкоднікам і інтэрвэнтам, арганізуюць чырвоныя абозы са збожжам, мясам, ільном, пянькой і г. д. У дзень адкрыцьця зьезду ў Дрыбін прыбылі 4 чырвоныя абозы з 68 фурманак.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ Ў РАЁНЕ АРГАНІЗАВАЛІСЯ ДВА НОВЫХ КАЛГАСЫ ІМЯ «VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ ДРЫБІНШЧЫНЫ».

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР і зьездам саветаў РАСОНСКАГА, КРУГЛЯНСКАГА і ЛЯДНЯНСКАГА раёнаў.

Амэрыканскі піонэр Гары Айзман, асуджаны нью-ёрскімі ўладамі на 15 месяцаў турмы за арганізацыю піянэрскіх атрадаў і камуністычныя выступленьні. Пасьля адбыцьця пакараньня т. Айзман быў высланы з Амэрыкі.

МЕНСК

Рабочае забесьпячэньне—у цэнтр увагі

Прэзыдыум гарсавету прызнаў незадавальняючым становішча рабочага забесьпячэньня ў Менску, асабліва прадуктамі харчаваньня. Пастанова СНК БССР аб забесьпячэньні насельніцтва плодагародніннай ня выканана (гадавы плян адгрузкі бульбы ў Менск выкананы на 43 проц., цыбулі — на 7 проц., гуркоў — на 41 проц. і г. д.). Створаных МЦРК запасаў плодагародніны на зіму ня хопіць нават і на грамадзкае харчаваньне.

Белсадсаюз, Белкаапсаюз і Белплодагародніна не прынялі належных мер для разгортваньня загатовак і поўнага выкананьня пляну адгрузкі ў Менск плодагародніны. **Наркамгандлю і Белкаапсаюз** па радзе прадуктаў (крупы, тлушчы, мука) ня мелі ўгрунтаванага цьвёрдага пляну забесьпячэньня гораду.

Апарат МЦРК не перабудаваў сваёй работы на лепшае абслугоўваньне пайшчыкаў. Чаргі, залежы тавараў на складах і іншыя недахопы дагэтуль яшчэ ня зжыты.

Прэзыдыум прапанаваў МЦРК гэрмінова арганізаваць загатоўку прадуктаў харчаваньня ад калгасаў і прыступіць да кантрактацыі гародніны і садавіны па 1931 год.

Прэзыдыум гарсавету зьвярнуўся ў ЦК ЛКСМБ і ЦСПСБ з просьбай вылучыць на пастаянную работу ў рабочай каапэрацыі 300 камсамольцаў і 300 рабочых.

Гарадзкому пракурору даручана паскорыць расьсьледваньне справы аб зрыве забесьпячэньня Менску дрывамі.

Падрыхтоўка да ленінскіх дзён

Фабзаўкомы саюзу мэталістаў разгарнулі шырокую падрыхтоўку да ленінскіх дзён. На прадпрыемствах у часе абедзеных перапынкаў праводзяцца гутаркі і даклады аб жыцьці і дзейнасьці У. І. Леніна і аб падзеях 9 студзеня 1905 году. Чырвоныя куткі абнаўляюцца. Бібліятэкі папаўняюцца ленінскай літаратурай. Арганізуюцца выстаўкі літаратуры.

19 студзеня ў клюбе мэталістаў адкрываецца вялікая выстаўка, прысьвечаная жыцьцю і дзейнасьці У. І. Леніна

15 студзеня на вечары рабочых мэталістаў была зачытана адозва беларускага камітэту саюзу мэталістаў аб падрыхтоўцы і правядзеньні ленінскіх дзён. Рабочыя пастанавілі арганізаваць спаборніцтва паміж прадпрыемствамі на лепшае правядзеньне ленінскіх дзён. Адозва Белкамітэту саюзу мэталістаў прапрацоўваецца на прадпрыемствах ва ўсіх цэхах, брыгадах і групах.

Арганізуюцца экскурсіі ў Музэй Рэвалюцыі. З 19 да 22 студзеня ў клюбе мэталістаў будуць адбывацца жалобныя вечары, прысьвечаныя памяці Леніна. 19 студзеня—вечар рабочых дробных прадпрыемстваў саюзу мэталістаў, 20 студзеня—вечар заводу «УДАРНІК» і «ВЗО», 21-га—заводу «КАМУНАР», 22-га—заводу «ЭНЭРГІЯ».

ДА ВЕЧАРОЎ ПАМЯЦІ ЛЕНІНА ПРЫСТАСОЎВАЕЦЦА ПЕРАДАЧА Ў ПАРТЫЮ ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ-УДАРНІКАЎ, А ТАКСАМА АРГАНІЗАЦЫЯ НОВЫХ УДАРНЫХ БРЫГАД.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ

Зьняць з работы лятуна Хмызава

Менш месяцу працаваў Хмызаў газэтаносцам Менскай паштовай канторы, атрымаў спэцвопратку і... зьнік. А потым апынуўся на рабоце на заводзе «Энэргія». Хмызаў упарта не жадае зьявіцца ў кантору для разьліку і здачы спэцвопраткі.

Дырэкцыя заводу «Энэргія» прыёўам Хмызава на работу натурае лятуноў-дэзарганізатарам вытворчасьці.

ЯКАЎЛЕЎ.

Былому дзяку і растратчыку—ня месца ў сельсавеце

Грамадзянін вёскі Радзілавічы (Вукчанскі с-савет, Тураўскага раёну) Супноўскі мае «багатае мінулае»: былы дзячок, два гады сядзеў у Допры за растрату каапэрацыйных грошай; на пленуме сельсавету выступіў супроць прымусовага спагнаньня запазычанасьці з кулакоў і г. д.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя «заслугі», Супноўскі нейкім чынам прапхаў у члены сельсавету. Раённая выбарчая камісія павінна зацікавіцца гэтым фактам.

П.

Алё! Цэнтральная! Слухайце!

Менская тэлефонная станцыя ўсё яшчэ працуе па-старыцы. Чаканьне на 20-30 хвілін аслужэньня з патрэбным абанэнтам — стала «нармальным зьявішчам», а калі ўжо злучаць, тэлефаністка кожную хвіліну перарывае размову. Трэба пакончыць з непарадкамі на тэлефонай станцыі.

Цыпіна.

Дзе абяцаныя прэміі?

Яшчэ ў 1929-30 г. інструктар Дзяржгандальбелу, тав. Майсеенка і былы старшыня магілеўскай экспартнай камісіі, тав. Тарасаў, абяцалі выдаць школам 9 прэмій за лепшы свой удзельсырцу.

Гаўрыленская школа (Касьцюковіцкі раён) сабрала 230 пуд. уцілю, што ў сярэднім складае на 48 клгр. на вучня (заданьне было 16 кгр.). Школа заняла першае месца ў раёне. Між тым, прэміі школа не атрымала і да гэтага часу. Гэта не магло не адбіцца на далейшай працы школы.

Вучком школы.

Арганізацыя інстытуту пабудоў і будаўнічай выстаўкі

СНК БССР пастанавіў арганізаваць беларускую будаўнічую выстаўку і Беларускі інстытут пабудоў. Створаны арганізацыйны камітэт у складзе т. т. Гольдбэрга (старшыня), Кавалёва, Васэрмана, Левіна, Сьліўкіна і прадстаўнікоў бюро інжынэрна-тэхнічных работнікаў, саюзу будаўнікоў і Галоўдартрансу. Аркамітэту запрапанавана распрацаваць праграму і плян работы і паставіць перад адведнымі органамі пытаньне аб водпуску сродкаў на арганізацыю выстаўкі і інстытуту.

Назначэньне

СНК БССР назначыў тав. ВАЛАСЕВІЧА членам прэзыдыуму ВСНГ БССР, ослабаніўшы яго ад абавязкаў Нам. наркома юстыцыі БССР.

Сьвярдлоўскі універсытэт—у дапамогу МОПР'у БССР

У Менск прыбылі 4 студэнты Сьвярдлоўскага універсытэту для дапамогі органам МОПР'у БССР у правядзеньні масава-прапагандысцкай работы.

ЦК МОПР'у БССР накіраваў гэтых таварышоў у Магілеў, Шклоў, Бабруйск, Віцебск і Барысаў для правядзеньня курсаў-канфэрэнцый і раду даклада аб задачах інтэрнацыянальнай работы ў ячэйках МОПР'у.

Пяцідзеўка краязнаўства

Цэнтральнае Бюро Краязнаўства пры Беларускай Акадэміі Навук праводзіць з 25 па 30 студзеня «пяцідзеўку краязнаўства».

Мэта «пяцідзеўкі»: выкрыць контррэвалюцыйныя нацыянал-дэмакратызм у краязнаўстве, зьвярнуць увагу савецкай грамадзянскасьці на вялізарную ролю краязнаўства ў сацыялістычным будаўніцтве і ўцягнуць у краязнаўчую работу шырокія масы працоўных гораду і вёскі.

Чыя брудная рука тут дзейнічае?

Разгарнуўшы паперу, у якую былі абвернуты прадукты, купленыя ў разьмеркавальніку № 4 МЦРК, мы выпадкова зьвярнулі ўвагу на тое, што надукавана на гэтай паперы:

«Цяперашні эканамічны крызіс разгортваецца на базе агульнага крызісу капіталізму, які ўзьнік яшчэ ў пэрыяд імпэрыялістычнай вайны, які надточвае падпоры капіталізму, які палегчыў набліжэньне эканамічнага крызісу».

Стыль такі знаёмы. Дасканала нібы точная характарыстыка нарэньняў сусьветнага эканамічнага крызісу.

Чытаем далей.

«Што гэта азначае? Гэта азначае перш за ўсё, што імпэрыялістычная вайна і ня вынікі ўзмацніла загніваньне капіталізму, падарвалі яго роўнавагу, што мы жывем цяпер у эпоху войн і рэвалюцый...»

Працірраем вочы, прачытваем да канца раздрадны, зьмятыя 3-4 старонкі. Сумненьні зьнікаюць. **Нечая брудная, шкодніцкая рука пусьціла на абёртку «палітычную справаздачу тав. Сталіна 16 зьезду»** (выданьне Беларгаспрэвыдавецтва, 1930 г. тыраж 48.000 экз.).

Адведныя органы павінны зацікавіцца гэтай справай і прыцягнуць тіпаватых да адказнасьці.

А. ФУРЭМС.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— БАН. У 19 гадз.—агульны адкрыты сход яч. КП(б)Б БАН. У 18 гадз.—сход камсамольскай яч. БАН. Яўка ўсіх асьпірантаў-камсамольцаў абавязкова.

— Дом Пісьменьніка. У 19 гадз.—пасяджэньне бюро менскай філіі БелАПП'у. На парадку дня—1) аб пляне працы на першы квартал 1931 г., 2) Стварэньне групы нарысістаў; 3) Розное. На пасяджэньне запрашаюцца т.т.: Ліпнёвы, Кляпаў, Зарэчны, Мяжэвіч, Лявонны, Шкаларэвіч, Жук, Барашка, Садоўскі, Ц. Верны, Іваноўскі, Шмідт, Сідарук, Каган, Іткін, Вайгаўх і Вярнікоўскі.

ЗАЎТРА:

— Клюб камунальнікаў. У 19 гадз.—агульны сход хатніх работніц мясцкому № 3. У парадку дня—справаздача гарсавету. Яўка ўсіх абавязкова.

— Дом Асьветы. 20-1 31 г., у 20 гадз.—урачысты сход навуковых працаўнікоў г. Менску, прысьвечаны гадавіне сьмерці Леніна. Уваход вольны.

— Клюб навуковых працаўнікоў. Навуковыя працаўнікі, у якіх ёсьць кнігі бібліятэкі клюбу, павінны здаць у 3-хдзённы тэрмін. Кнігі прымаюцца ў клюбе з 7-10 гадз. веч.

— ПК ЦКК КП(б)Б просіць т. Палікарпава—б. загадчыка цэрахоўскай ашчадкасы—паведаміць свой адрас. Адначасова просьба да ўсіх т. т., якія ведаюць, дзе знаходзіцца т. Палікарпаў, паведаміць у ПК ЦКК КП(б)Б.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-80	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-74	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		„ абвестак	7-32

Умовы падпіскі (з дарожным дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	1 р.
„ 3 мес.	3 „
„ 6 мес.	6 „
„ 12 мес.	12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок моцн. пасьля тэксту—50 к., іншы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасьлядоўны тэкст—у два разы дарожэй. Арэ пытаньнямі друкаваньні—скідка. Зьвяні тарыфу згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбаўку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты „ЗЬВЯЗДЫ" Менск, Савецкая 63, 2-гі паверх, тэл. 7-31.

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты

пічыць несапраўднымі

Чл. біл. с. чыг., 2 пасьв. на хав. абл. з паз. інд. Прастак М. М., 3554-3555; парт. біл. № 0817510 Мен. АК КП(б)Б Патапчука А. І., 3556; чл. біл. с. бул. № 6/48817, камс. біл. № 159083 Фрунз. РК ЛКСМБ, бірж. карт. № 130 Мен. біржы пр., дав. аб пр. БЖС Файна Л. Ф., 3557-3560; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Раманчука Л. В., 3561; партыз. пасьв. № 83 Мен. гарсав., пенс. кн. НКСЗ № 177 Пуцерпнік М. Г., 3562-3563; пасьв. аб маем. і сап. стан. Курдзіцк. с.-с. Канскай П. Л., 3564; фаб. № 259 ф-кі «Беларуска» Шорнікава М. Е., 3565; чл. біл. с. скур. № 6620 Клебашова С. І., 3566; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Ханелеса Д. Б., 3567; лек. кн. Мен. страхк. Ханелеса Б. Д., 3568; пашп. Прат. РВК, дав. аб маем. Ржэўск. с.-с. Пазьнікова І. Н., 3569-3570; мэтр. вып. прыгар. с.-с. Краўчонка В. М., 3571; дав. аб пр. гол. Мен. мін. Ермака А. І., 3572; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Дземо Н. В., 3573; лек. кн. Мен. страхк. Бэрштэйна М. Я., 3574; чл. біл с. чыг. Палікарпава П. А., 3575; бірж. карт. Мен. біржы пр., квіт. на атрым. прамтав. МЦРК Элькінд Э., 3576-3577; дав. аб маем. Бароўск. с.-с. Лісьноўскай Г. Я., 3678; членск. білет саюзу МСП Камінскай У. С., 3579; канд. карт. № 32911 Пух. РК КП(б)Б Некарчык А. С., 3580; вайск. кн. Засл. РВК Дубатоўкі Я. С., 3581; пасьв. на атр. дапам. Мен. Саб. Чакатоўскага У. С., 3582; чл. біл. с. СГС Юдовіч Э. К., 3583; конск. карт. Копд. РВК Гершыновіча Б., 3584; чл. біл. с. СГС Латушка Л. Я., 3585; пашп. Мен. мін. Перэльмана І. М., 3586; чл. біл. с. пархарч Раякевіч Н. І., 3587; выкан. ліст Мен. нарсуд 2 вуч. Дамброўскай Я. К., 3588; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Шаліма С. Я., 3589; чл. біл. с. РЗЛ № 86086 Дудкіна П. А., 3590; пашп. Мен. мін. Дзяк. К. І., 3591; вайск. кн. Мен. ваенк. Гарашкевіча Я. Р., 3592; чл. біл. с. бул., кн. на карм. дайц. Мен. страхк., кн. яшчад. касы, валёс. карт. Мен. гарфа Песьняка Н. М., 3593-3596; пасьв. трап.-экзп. техн. Кураксвіча В. А. 3597; пасьв. Мен. курс. ЦПП Данхіна М. М., 3598; паап. кн. Слуцк. спажк. т-ва Дзяжурнай А. І., 3599; чл. біл. с. мэт. Квіткевіча М. М., 3600; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Яраш-эвіча Н. Г., 3601; ас. пасьв. зав. «Камунар» Квіткевіча М. М., 3602; 2 кон. кн. Мен. васпк. Пятрусевіча М., 3603-3604; пасьв. аб скапч. 7-годкі Сіроткі А. Ф., 3605; дав. аб выб. пр. Мен. мін. Сьцяпуты А. М., 3606; вайск. кн. Мен. ваенк., чл. біл. с. СГС. Фалей М. Я., 3607-3608; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Шпэйдзік Л. Р., 3609; пашп. Рат. с.-с. Байкова А. Я., 3610; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Шпэйдэрмана М. І., 3611; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Фарбер Л. М., 3612, кн. на карм. дайц. Мен. страхк. Саламянскага М., 3613; чл. біл. № 329706 с. мэт., вайск. біл. Мен. ваенк. Богадаяж М. Е., 3614-3615; пашп. Бароўск. с.-с. Дразда Р. А., 3616; чл. біл. с. пэвін. Левіна Х. Л., 3617; пашп. Сек. мін. Шэрмана Э. Ю., 3618; чл. біл. с. працасв. Завароўскав З. С., 3619.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр

Сёньня, 17 студзеня—спэктакль для абуткоўкі ф-кі

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

Пачатак у 9 гадз. веч.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

1. ВОСТРАЎ БЕГЛЯКОЎ драма ў 6 частках.
2. Глядзі ў корань кіно-фільтэон.
3. Замерны гукавы кіно-фільм ЧЭМПІЁНЫ ПЛАВАНЬНЯ

Пачатак 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз. веч.

Кіно-тэатр „Культура"

Лепшы фільм сэзону з эпохі грамадзянскай вайны ТАБЕ ДАРУ драма ў 6 разьдзелах. Кіно-хроніка „Савэкіно" № 64. Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м. Каса—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал"

Цікавы фільм паводле вядомага апавяданьня Шолам-Алейхэма ЯЎРЭЙСКАЕ ШЧАСЬЦЕ — ЗВЫШ П РАГРАМЫ — часопіс „Савэкіно" № 63. П пачатак 1-га сэансу—6 гадз. Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"

Амэрыканскі прыгодніцкі фільм ЧОРНЫ ЦЫКЛЁН

Пачатак: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянэр"

Апошняя сэрыя „ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВАЛЯТА" кіно-аповесьць у 6 част. Пачатак: 1 гадз., 2 гадз. і 3 гадз. дня. Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО „СпартаК"

Звыш праграмы тастролі арт. ленінградзкага тэатру С. М. ВОЛКАВЫ і А — на экране ПАЛАЧЫ ў 7 частках з пралёгам. Пачатак 7 г., 9, 11 гадз. Каса—з 5 гадзін.

Кавфэрэнцыя чытачоў „ПРАВДЫ"

адбудзецца сёньня, 17-га студзеня, у 6 гадз. веч. у Доме Камасьветы.

Даклад прадстаўніка рэдакцыі газ. «Правда». Мастацкая частка.

Запрашаюцца партактыў і беспартыйныя чытачы «Правды».

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Пятніца, 23 студзеня. Субота, 24 студзеня адбудуцца ДВА КАНЦЭРТЫ 1-га ў СССР СЫМФАНІЧНАГА АРКЕСТРУ ГАРМАНІСТАЎ у складзе 22 ч. пад кіраўн. дырыжэра Л. М. БЯКОВА.

Аркестр выконвае вялікія сымфанічныя творы, сольныя нумары, трыё, квартэт на гармоніках і канцэртныя

Білеты прадаюцца шт одзенна з 17-га студзеня ў раб. касе з 12—2 і з 4—6 гадз., у касе тэатру—з 12—2 і з 5—9 гадз. Пачатак у 8 з пал. гадз.

Адказны распарадчык БЕЛ. АДДЗ. СЯФІЛУ.

Завочныя Дзяржкурсы Росьпісу

(РАЗРЫСОЎКІ) па ўсемагч. тканінах. Фарбамі: рэльефн., алейн., эмалев. пырскамі. Прысыпкамі: бліскуч., бісэр, жамчуг і інш.

Способы: нераспліва. аніліну, празрыст. росьпісу мяккага золата, каляровага срэбра. Росьпіс гдінян., шкіран. насуды, цэлюлёіда, скуры, дрэва. Да лекцый прыкладаецца звыш 200 малюнк. (акрамя тэкставых).

Па скапчэньні выд. пасьведчэньне. Укеньне малюн. не патрэбуецца. Падрабязнасьці высыл. за 20 к. дробн. пашт. маркамі.

МАСКВА, вул. Дзяржынскага, д. № 1. ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ СОНО.

Праектна-канструктарскае бюро БУДАБ'ЯДНАНЬНЯ

ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ

—) па сьветакапіяваньні (—

ЧАРЦЯЖОЎ

НА СВАЁЙ ПАПЕРЫ.

З арганізацыямі, якія здаюць буйныя заказы на капіяваньні, заключаюцца умовы. Работы выконваюцца ПА ЗЬНІЖАНЫМ ЦАНЕ.

Адрас: Рэвалюцыйная, 3, тэлеф. 10-40.

Праэктбюро Будаб'яднаньня.

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ 1 р. і дакуманту

КУ